УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»
ФАКУЛЬТЭТ ІНФАРМАЦЫЙНА-ДАКУМЕНТНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ
КАФЕДРА ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА<br>Загадчык кафедры<br>інфармацыйных рэсурсаў<br><br>_____________Ж.Л.Раманава<br>___ ____________20___ г. | УЗГОДНЕНА<br>Дэкан факультэта<br>інфармацыйна- дакументных<br>камунікацый<br>___________Ю.М.Галкоўская<br>___ ____________20___ г. |

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС

ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ РЭСУРСЫ САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНАЙ СФЕРЫ

для спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць
(па напрамках)

Складальнікі:

**С. У. Маланухіна**,магістр педагагічных навук, ст. выкладчык

**Л. І. Даніленка**, вядучы бібліятэкар аддзела карпаратыўнага ўзаемадзеяння
ДУ “Нацыянальная бібліятэка Беларусі”

Разгледжана і зацверджана

на пасяджэнні Савета ўніверсітэта “19” сакавіка 2019 г.

пратакол №7

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Складальнікі:
*С.У. Маланухіна,*старшы выкладчык кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, магістр педагагічных навук;
*Л. І.Даніленка,* вядучы бібліятэкар аддзела карпаратыўнага ўзаемадзеяння ДУ “Нацыянальная бібліятэка Беларусі”

Рэцэнзенты:
*Л.А.Аўгуль,* загадчык навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Цэнтральной навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;

*Ю.М.Галкоўская*, дацэнт кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, кандыдат педагагічных навук

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння

*Кафедрай інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі“Беларускі дзяржаўныўніверсітэт культуры і мастацтваў”*
*(пратакол ад 26.02.2019 № 7);*

*Саветам факультэтаінфармацйна-дакументных камунікацый*
*(пратакол ад ____________ № __);*

# Змест


1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА
2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ
2.1 Канспект лекцый
3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ
3.1 Тэматыка і метадычныя парады да выканання практычных і лабараторных заняткаў
3.2 Тэматыка і метадычныя парады да семінарскіх заняткаў
4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ
4.1 Графік кантролю самастойнай працы студэнтаў
4.2 Тэматыка і метадычныя парады да выканання самастойнай работы
4.3 Пытанні да экзамену
4.4 Тэмы курсавых работ
4.5 Пералік сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці
5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ
5.1 Вучэбная праграма
5.2 Асноўная літаратура
5.3 Дадатковая літаратура
5.4 Слоўнік тэрмінаў і азначэнняў заканадаўства


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Інфармацыйныя рэсурсы сацыяльна-гуманітарнай сферы” (ІР СГС) – адзін з раздзелаў дысцыпліны “Інфармацыйныя рэсурсы”. Яна вывучаецца студэнтамі ўсіх напрамкаў спецыяльнасці “Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць” дзённай і завочнай формаў навучання.

Актуальнасць вывучэння дысцыпліны абумоўлена ўзрастаннем ролі інфармацыйных рэсурсаў як важнейшага фактара сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства, павышэння эфектыўнасці дзяржаўнай палітыкі, даследаванняў у галіне сацыяльна-гуманітарных навук, падрыхтоўкі прафесійных кадраў для розных сфер жыццядзейнасці грамадства, а таксама выкарыстаннем інфармацыйных рэсурсаў ў працэсе інавацыйнай прафесійнай практычнай дзейнасці ў сацыяльна-гуманітарнай сферы, фарміраванні інфармацыйнай і прававой культуры грамадства, сацыялізацыі асобы.

Мэта дысцыпліны – засваенне студэнтамі ўяўленняў аб спецыфіцы інфармацыйных рэсурсах сацыяльна-гуманітарнай сферы грамадства, іх арганізацыйнай структуры, авалоданне навыкамі іх фарміравання і выкарыстання ў бібліятэцы як адным з інстытутаў сацыяльных камунікацый.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумовіла кола задач, якія вырашаюцца ў працэсе авалодання матэрыялам дысцыпліны:

– раскрыць асаблівасці інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы;

– пазнаёміць студэнтаў з арганізацыйнай структурай інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы;

– паказаць тэндэнцыі развіцця інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь і за мяжой;

– дапамагчы студэнтам авалодаць першаснымі навыкамі фарміравання розных відаў інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы і іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстання пры задавальненні інфармацыйных патрэбнайсцей карыстальнікаў сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ва ўмовах бібліятэк.

Праграма распрацавана для вышэйшых навучальных установ Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках).

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам 1-23 01 11 “Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)” зместам вучэбнай дысцыпліны прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый:

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем.

АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных устройстваў, кіраваннем інфармацыяй і работай з камп’ютарам.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-9. Умець вучыцца, самастойна павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

АК-10. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі ўменнямі, якія забяспечваюць вырашэнне задач інавацыйна-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

САК-1. Валодаць якасцямі грамадскасці.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і сусвету, культурных традыцыяў і рэлігійных поглядаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-1. Выконваць бібліятэчна-інфармацыйныя тэхналагічныя працэсы ў асяроддзі сучасных аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм (АБІС).

ПК-4. Весці інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў розных сфер дзейнасці.

ПК-5. Весці бібліятэчнае абслугоўванне розных груп карыстальнікаў.

ПК-6. Ажыццяўляць традыцыйную і электронную выдачу і дастаўку дакументаў.

ПК-7. Фарміраваць інфармацыйную культуру карыстальнікаў.

ПК-31. Праводзіць маркетынгавыя даследаванні інфармацыйнага рынку;

ПК-32. Ствараць аналітычныя інфармацыйныя прадукты і паслугі;

ПК-33. Ажыццяўляць інфармацыйнае суправаджэнне розных сфер дзейнасці;

ПК-34. Кіраваць інфармацыйнымі рэсурсамі ўстаноў.

Пералічаныя кампетэнцыі прадугледжваюць фарміраванне ведаў, уменняў і навыкаў.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***ведаць***:

– відавы і галіновы склад інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы грамадства,

– арганізацыйную структуру інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы;

– тэхналогію фарміравання і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы;

– асноўныя групы карыстальнікаў інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы і асаблівасці іх інфармацыйных патрэбнасцей;

***умець:***

– ажыццяўляць тэхналагічныя працэсы стварэння інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ў традыцыйным і аўтаматызаваным рэжымах;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– ствараць розныя віды інфармацыйных прадуктаў і паслуг;

– абслугоўваць карыстальнікаў сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі з выкарыстаннем інфармацыйных рэсурсаў ў розных рэжымах.

*валодаць:*

– пошукавымі магчымасцямі галіновых інфармацыйных рэсурсаў;

– сістэмай пошуку інфармацыі для задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей розных катэгорый карыстальнікаў.

У выніку засваення зместу дысцыпліны, актыўна выкарыстоўваючы эфектыўныя педагагічныя методыкі і сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі, студэнты павінны авалодаць ведамі, уменнямі і навыкамі, неабходнымі для вырашэння прафесійных тэарэтычных і пратычных задач, што прадугледжана адукацыйным стандартам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1. КАНСПЕКТЫ ЛЕКЦЫЙ

## РАЗДЗЕЛ І. ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНАЙ СФЕРЫ

### Лекцыя 1.

### Сацыяльна-гуманітарная сфера грамадства як асяродак функцыянавання інфармацыйных рэсурсаў

Тэрмін «сацыяльны» выкарыстоўваецца ў навуцы ў шырокім і вузкім значэнні. У шырокім сэнсе слова «сацыяльны» ужываецца як сінонім «грамадскі». Метадалагічнай асновай такога падыходу з'явіліся ідэі класікаў замежнай і расійскай сацыяльнай думкі: К. Маркса, Р. Мюнха, Н. Луманна, Т. Парсанса, Ю. Хабермаса, а таксама Н. Я. Данілеўскага, П. Л. Лаўрова, Н. К. Міхайлоўскага і інш.

У вузкім значэнні слова «сацыяльны» ўжываецца як адносна самастойная сфера грамадскага жыцця разам з матэрыяльна-вытворчай, палітычнай, культурна-духоўнай сферамі.

Сацыяльная сфера ўяўляе сабой спецыфічную прастору сувязей і адносін, якія складваюцца паміж людзьмі, і ўключае ўсю сукупнасць умоў і фактараў, якія забяспечваюць развіццё і ўдасаналенне грамадсіх груп і індывідаў.

У адпаведнасці са структурай сацыяльнай сферы і сацыяльна-гуманітарных навук разглядаюць інфармацыйныя рэсурсы *па*: сацыялогіі; статыстыцы; дэмаграфіі; гісторыі, гістарычных навуках, крыніцазнаўстве, дапаможных (спецыяльных) гістарычных дысцыплінах; эканоміцы, эканамічных навуках; палітыцы, палітычных навуках; праве, правазнаўстве;. ваеннай справе, ваеннай навуцы; культуры, культуралогіі; навуцы, навуказнаўстве; навукова-інфармацыйнай дзейнасці, інфарматыцы; адукацыі, педагагічных навуках; сродках масавай інфармацыі, журналістыцы; кніжнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

справе, кнігазнаўстве; бібліятэчнай справе, бібліятэказнаўстве; бібліяграфіі, бібліяграфазнаўстве; музейнай справе,музеязнаўстве; архіўнай справе, архівазнаўстве; мовазнаўстве; рэлігіі, рэлігіязнаўстве; філасофіі; псіхалогіі.

Інфармацыйныя рэсурсы ўяўляюць сабой назапашаную грамадствам інфармацыю і забяспечваюць перадачу гэтай інфармацыі ў выглядзе ведаў у часе і прасторы для вырашэння разнастайных задач (вытворчых, эканамічных, навуковых, упраўленчых, культурных і інш.).

Інфармацыйныя рэсурсы з’яўляюцца важнейшай часткай грамадства. У наш час пад інфармацыйным рэсурсамі разумеюць дакументы і іх масівы ў інфармацыйных сістэмамах (бібліятэках, архівах, інфармацыйных цэнтрах і г.д.).

Яшчэ ў сярэдзіне XX стагоддзя матэрыяльныя носьбіты інфармацыйных рэсурсаў абмяжоўваліся традыцыйнымі друкаванымі выданнямі, фотаздымкамі, механічным гуказапісам. Другая палова XX стагоддзя адзначана хуткім ростам электронных (цыфравых) інфармацыйных рэсурсаў. Аднак замена відаў матэрыяльных носьбітаў не аказала ўплыву на тыпалогію асноўнага складу інфармацыйных рэсурсаў.

У склад інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ўваходзяць:

– створаныя раней і ставараемыя зараз апублікаваныя і неапублікаваныя першасныя дакументы на любых носьбітах (кнігі, перыядычныя выданні, і інш.);
– бібліяграфічныя, фактаграфічныя і поўнатэкставыя базы дадзеных (БД);
– фонды апублікаваных і неапублікаваных першасных дакументаў бібліятэк, архіваў і іншых устаноў;
– бібліяграфічная прадукцыя;
– аглядна-аналітычная прадукцыя (аналітычныя агляды, прагнозы, рэйтынгі і інш.);
– паслугі, прапануемыя на інфармацыйным рынку;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– установы (выдавецтвы, рэдакцыі, бібліятэкі, інфармацыйныя цэнтры, кнігагандлёвыя ўстановы і інш.), якія з’яўляюцца сттваральнікамі інфармацыйнай прадукцыі, назапашваюць і выкарыстоўваюць інфармацыйныя рэсурсы.

Інфармацыйныя рэсурсы сацыяльна-гуманітарнай сферы маюць пэўныя *ўласцівасці*, якія ўплываюць на працэсы іх фарміравання і забеспячэння даступнасці:

– Невыдаткоўваемасць, невычарпальнасць, якія забяспечваюць магчымасць шматразовага і шматмэтавага іх выкарыстання;
– несупынны рост аб’ёму патока інфрмацыі;
– зменлівасць складу як рэакцыя на змяненні інфармацыйных патрэб грамадства і абумоўлены гэтым дынамізм пардукцыі і паслуг на інфармацыйным рынку;
– складанасць выдзялення актыўнай і пасіўнай часткі інфармацыйных рэсурсаў праз розныя тэмпы старэння інфармацыі. Адсутнасць прамой залежнасці паміж часам стварэння інфармацыі і яе каштоўнасцю, так як інфармацыя страчвае каштоўнасць не ад часу, а праз з’яўленне новых ведаў і інш.

Нарматыўная база стварэння і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў сацыяяльна-гуманітарнай сферы фарміруцца ў межах інфармацыйнага заканадаўства. У склад нарматыўнай базы ўваходзяць нарматыўныя акты, якія дазваляюць рэгуляваць нормы, звязаныя са стварэннем, захоўваннем, выкарыстаннем і абаронай інфармацыйных рэсурсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратура:

1.Захарчук, Т.В. Інфармацыйныя рэсурсы для бібліятэк: вучэбна-практ. дапаможнік / Т. В. Захарчук. – СПб: Прафесія, 2011. – 126 с.
2.Галіновыя інфармацыйныя рэсурсы: падручнік / рэд.: Р.С. Гілярэўскі, Т.В. Захарчук. – СПб.: Прафесія, 2015. – 415 с.

## Лекцыя 2.

### Патрэбнасці грамадства ў дакументнай сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі. Карыстальнікі сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі

Дыферынцыяцыя карыстальнікаў сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці са структурай сацыяльнай сферы і сацыяльна-гуманітарных навук.

Асноўныя групы карыстальнікаў сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ў сферы *філасофіі і сацыялогіі*: студэнты, аспіранты, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў, супрацоўнікі даследчых інстытутаў і інш. Запатрабаванымі з'яўляюццатакія такія крыніцы інфармацыі як манаграфіі, артыкулы з навуковых галіновых і міжгаліновых часопісаў, матэрыялы канферэнцый, крыніцазнаўчая і вучэбная літаратура. Сацыёлагам, якія праводзяць прыкладныя даследаванні, неабходны апублікаваныя вынікі праектаў, матэрыялы палявых даследаванняў, якія назапашваюцца ў архівах профільных устаноў. Інфармацыйныя патрэбнасці навуковых супрацоўнікаў і выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў характарызуюцца тэматычнай разнастайнасцю.

Асноўныя групы карыстальнікаў сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ў сферы *паліталогіі*: палітолагі, аналітыкі, удзельнікі выбарчых кампаній, журналісты, сацыёлагі, выкладчыкі і студэнты спецыяльных дыцыплін. Для апошніх найбольшую цікавасць уяўляюць выданні вучэбнай і даведачнай інфармацыі, сукупнасць профільных інфармацыйных рэсурсаў, як традыцыйных, так і электронных. Пры правядзенні выбарчых кампаній запатрабаванай з'яўляецца інфармацыя фактаграфічнага зместу.

Асноўныя групы карыстальнікаў сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ў сферы *права*: карыстальнікамі прававой інфармацыі з'яўляюцца амаль усе грамадзяне краіны. Навуковая інфармацыя, інфармацыя па пратыцы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прымянення заканадаўства неабходна даследчыкам у галіне права, практыкуючым юрыстам, выкладчыкам, студэнтам і аспірантам юрыдычных вузаў. Прадпрымальнікам і кіраўнікам арганізацый і прадпрыемстваў, менеджарам па персаналу патрэбна практычная прававая інфармацыя, якая звязана з правіламі вядзення бізнесу, працоўным заканадаўствам. Пенсіянераў цікавяць разнастайныя пытанні жыллёвага і сацыяльнага заканадаўства. Для сямей з дзецьмі запатрабаванай з'яўляецца інфармацыя аб правах дзіцяці, семейным заканадаўстве. Дастаткова шырокі спектр карыстальнікаў прававой інфармацыі і іх інфармацыйных патрэбнасцей аказваюць значны ўплыў на дакументны паток, які фарміруецца ў прававой сферы.

Асноўныя групы карыстальнікаў сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ў сферы *эканомікі*: сярод карыстальнікаў эканамічнай інфармацыі могуць быць выдзелены даследыкі, выкладчыкі і студэнты эканамічных дысцыплін, спецыялісты смежных галін дзейнасці, кіраўнікі і супрацоўнікі прадпрыемстваў, а таксама масавая аўдыторыя.

Навуковых даследчыкаў цікавіць аператыўная інфармацыя – матэрыялы канферэнцый, артыкулы з навуковых часопісаў і зборнікаў, навуковыя справаздачы, дысертацыі. Для збору эмпірычных дадзеных часта фарміруюцца картатэкі і масівы дадзеных. Пошук вядзецца праз бібліяграфічныя паказальнікі, спіскі цытуемай літаратуры, каталогі і картатэкі спецыялізаваных бібліятэк.

Выкладчкі і студэнты эканамічных дысцыплін максімальна выкарыстоўваюць вучэбную, замежную і айчынную даведачную літаратуру, вучэбныя праграмы і планы па асобным спецыльнасцям эканамічных навук, перыядычныя выданні.

Кіраўнікі і супрацоўнікі прадпрыемстваў (дырэктар, галоўны бухгалтар, галоўны эканаміст, намеснік дырэктара па камерцыйных пытаннях, кіраўнікі планава-эканамічнага, маркетынгавага аддзелаў і інш.) маюць неабходнасць атрымання прафесійна неабходнай інфармацыі па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шырокаму накірунку эканамічных пытанняў дзейнасці фірмы. Цікавасць уяўляе інфармацыя эканамічнай і дэмаграфічнай статыстыкі, справаздачы аб папярэдніх даследаваннях асобных сегментаў рынку груп кліентаў, тавараў, цэн, навіны біржавага і фінансавага рынку, дзелавыя навіны рэгіёна і інш.

Спецялістам фірм (эканамістам, аўдытарам, тавараведам, маркетолагам, бізнес-аналітыкам і інш.) неабходна інфармацыя для ажыццяўлення эканамічнай практыкі: інструкцыіі па фінансава-эанамічным разлікам, нормы налогаў і збораў, нарматывы часу, расхлодных матэрыялаў, бізнес-планы, справаздачы фірм, прэйскуранты, коды банкаў, каталогіі прадукцыіі і інш. Істотна дыферынцыруюцца карыстальнікі інфармацыіі не толькі па пасадавых абавязках, але і па напрамках эанамічнай дзейнасці.

Асноўныя групы карыстальнікаў сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ў сферы *педагогікі і псіхалогіі*: карыстальнікамі з'яўляюцца навукоўцы, настаўнікі ўстаноў адукацыі, выкладчыкі вузаў, студэнты і аспіранты педагагічных вузаў, арганізатары адукацыі. Іх інфармацыйныя патрэбнасці вельмі разнастайныя. З аднаго боку патрэбнасць у навуковай і метадычнай педагагічнай інфармацыі агульнага накірунку, з другога боку – неабходна аператыўная інфармацыя аб выкладаемай дысцыпліне. Арганізатарам адукацыі неабходна, у першую чаргу, афіцыйная інфармацыя, якая датычыць арганізацыі вучэбнага і выхаваўчага працэсаў. Асноўнымі групамі карыстальнікаў псіхалагічнай інфармацыі з'яўляюцца: вучоныя-даследчыкі ў розных галінах псіхалагічнай навукі, псіхолагі-практыкі, урачы, якія выкарыстоўваюць метады і прыёмы медыцынскай псіхалогіі, педагогі-псіхолагі і інш.

Асноўныя групы карыстальнікаў сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ў сферы *гісторыі і гістарычных навук*: даследчыкі і навуковыя супрацоўнікі, якія рыхтуюць манаграфіі і навуковыя артыкулы; выкладчыкі гітарычных дысцыплін; супрацоўнікі музеяў і архіваў, а таксама аўдыторыя неспецыялістаў, якія цікавяцца інфармацыйнымі рэсурсамі з асабістых інтарэсаў (пісьменнікі, журналісты і інш.). Спецыялістаў у дадзенай сферы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часам раздзяляюць яшчэ па іншых прыкметах, напрыклад, па спецыялізацыі: археолагі, этнографы, гістрыкі, альбо па тэматыцы даследаванняў: эканамічная гісторыя і інш., па эпохам: Сярэднявечча, Новы час і г.д.

Літаратура:

1.Горбачева, Л.В. Информационные потребности специалистов социокультурной сферы: некоторые подходы и технологии к выявлению и обеспечению / Л.В. Горбачева // Современные информационные технологии в Национальной библиотеке Беларуси : сб. ст. / Национальная библиотека Беларуси ; сост. А. А. Шереметьева. – Минск : Национальная библиотека Беларуси, 2008. – С. 92–106.
2.Захарчук, Т.В. Інфармацыйныя рэсурсы для бібліятэк: вучэбна-практ. дапаможнік / Т. В. Захарчук. – СПб: Прафесія, 2011. – 126 с.

## Лекцыя 3.

## Спецыфіка інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы

Інфармацыйныя рэсурсы навук сацыяльнага цыклу ўтрымліваюць агульныя і прыватныя прыкметы, якія звязаны са спецыфікай прадметнай вобласці. Агульныя рысы абумоўлены адзінствм іх складанага аб’екту даследавання – чалавек і свет, блізкімі метадамі і мэтамі яго вывучэння, а таксама гісторыяй фарміравання галіновых ведаў.

Сучасная філасофія фарміруе паток навуковай і даведачнай літаратуры ў сферы логікі, тэорыі пазнання – эпістымалогіі, сацыяльнай філасофіі, этыкі, эстэтыкі, гісторыі філасофіі.

Асобныя навукі з’явіліся падчас асэнсавання ролі сацыяльна-палітычных адносін у грамадстве. Яны вельмі цесна ўзаемазвязаны паміж сабой аб’ектам і мэтай вывучэння: разуменне заканамернасцей грамадскага жыцця выступае залогам яго пазітыўнага развіцця. Сацыялогія і паліталогія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разглядаюца як практыка сацыяльнай філасофіі, а ў якасці самастойных галін ведаў фаміруюцца ў сярэдзіне XIX стагоддзя.

Сучасная сацыялогія фарміруе тэарэтычныя ўяўленні аб грамадстве ў цэлым, абагульняе канкрэтную сацыялагічную інфармацыю, фарміруе сацыяльны прагноз, сацыяльныя праграмы развіцця грамадства.Асаблівасцю сацыяльных ведаў з’яляецца іх атрыманне на аснове вынікаў палявых даследаванняў асобных сацыяльных супольнасцяў.

Паліталогія фарміруе сістэму каштоўнасцей для ацэнкі палітычных рашэнняў, палітычных інстытутаў і падзей. Палітолагі вывучаюць пытанні палітычнай улады, механізмы яе стабільнасці, бягучае палітычнае жыццё і крызісныя сітуацыі ў ім.

Сацыяльныя задачы выдзяляюць асобныя блокі інфармацыйных рэсурсаў – дадзеныя аб грамадскім меркаванні, сацыяльныя прагнозы, праграмы развіцця, а прыярытэтам выступаюць аператыўныя каналы давядзення аналітычнай інфармацыі і навін.

Для інфармацыйных рэсурсаў у галіне філасофіі, сацыялогіі і паліталогіі характэрны агульныя прыкметы, якія звязаны з высокім узроўнем абагульнення звестак аб даследуемых аб’ектах:

– доўгачасовае выкарыстанне асноўных (ключавых) крыніц інфармацыі (“залатога фонду” літаратуры) усіх трох галін ведаў;
– наяўнасць дакументаў па тэме з супрацьлегымі меркаваннямі аб з’яве ці прадмеце;
– узаемнае выкарыстанне галіновых рэсурсаў (цесныя сувязі паміж навукамі сацыяльнага цыклу падцвярджаюцца размяшчэннем тэкстаў у агульных выдавецтвах, часопісах, на тэматычных сайтах, а таксама ўзаемным выкарыстаннем навуковай інфармацыі);
– значнасць прагнознай і аглядна-аналітычнай інфармацыі аб жыцці грамадства.

Структура галіны права абумоўлівае асаблівасці прававаой інфармацыі.Яе спецыфіка заключаецца ў тым, што незалежна ад свайго зместу яна заўсёды

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

валодае пэўнай сацыяльнай значнасцю. Прававая інфармацыя рэгулюе гаспадарчае і сацыяльна-культурнае жыццё грамадства. Да прававой інфармацыі адносяцца, у першую чаргу, прававыя акты, а таксама ўся інфармацыя, якая звязана з правам, матэрыялы аб прававой адукацыі і распрацоўкі канцэпцый развіцця права. Прававую інфармацыю можна вызначыць як масіў прававых актаў і звязаных з імі даведачных, нарматыўна-тэхнічных і навуковых матэрыялаў, якія ахопліваюць усе сферы прававой дзейнасці.

Змястоўна прававая інфармацыя ўключае звесткі аб фактах, падзеях, асобах, з’явах прававой сферы жыцця грмадства. Спецыяялісты падкрэсліваюь, што для прававой інфармацыі характэрны складанасць і шматграннасць, так як яна вельмі цесна завязана з такімі паняццямі, як права, прававая сістэма. Прававая інфармацыя рэгулюе асобныя бакі гаспадарчай і сацыяльна-культурнай дзейнасці грамадства. Гэта і вызначае яе яе прагматычны характар.

Тыпалогія прававой інфармацыі. У навуковай літаратуры часта сустракаецца падзел прававой інфармацыі на *афіцыйную* і *неафіцыйную.*Да афіцыйнай адносяць нарматыўныя акты вышэйшых і месных органаў улады і кіравання, міністэрстваў і ведамстваў, акты судовых органаў. Неафіцыйная прававая інфармацыя прадстаўлена масівам загадаў, распараджэнняў кіраўнікоў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, судовымі прысудамі, актамі натарыяльных кантор і інш. Яны карысны для асобных карыстальнікаў і асобных сітуацый, але не маюць шырокага агульнадзяржаўнага статуса і значэння.

Па крыніцы ўзнікнавення прававая інфармацыя падзяляецца на *першасную і другасную*. Першасную прававую інармацыю прадстаўляюць арыгіналы прававых актаў, прымаемыя ўсімі структурамі праватворчых, праваахоўчых органаў, якія выступаюць генератараміт гэтай інфармацыі і ў той жа час першаснымі інфармацыйнымі органамі ў сістэме праавой інфармацыі. Другасная прававая інфармацыя, якая з’яўляецца вынікам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аналітыка-сінтэтычнай і лагічнай перапрацоўкі інфармацыйнага зместу першаснага дакумента, прадстаўлена анатацыямі, рэфератамі, каментарыямі заканадаўства і судова-арбітражнай практыкі і інш.

Фактаграфічная прававая інфармацыя.

У залежнасці ад храналогіі стварэння – бягучая і рэтраспектыўная прававая інфармацыя.

У залежнасці ад аб'ёму ўтрымліваемай інфармацыі – поўная і няпоўная прававая інфармацыя.

У залежнасці ад зместу інфармацыі – дакладная і недакладная прававая інфармацыя і г.д.

Тыпалогія прававой інфармацыі не з'яўляецца канчаткова вычарпальнай , патрабуе дапрацовак як з боку інфармацыйных работнікаў, так і прававедаў.

Інфармацыйныя рэсурсы ў галіне *эканомікі* маюць свае адметныя рысы:

– наяўнасць эканамічнай інфармацыі амаль для ўсіх груп насельніцтва;
– шырокае распаўсюджванне эканамічнай адукацыі, неабхднасць вучэбных матэрыялаў для дысцыплін розных спецыяльнасцей;
– вялікая колькасць фактаграфічных інфармацыйных рэсурсаў (звесткі аб прадпрыемствах, галінах гаспадарчай дзейнасці, рэгіёнах і асобных краінах), іх хуткае старэнне, неабходнасць аналізу  і сінтэзу дадзеных;
– значнасць прававой інфармацыі ў сферы эканамічных узаемаадносін;
– неабходнасць інфармацыйнага маніторынгу рынкаў, слабы прагноз складаных эканамічных сістэм.

Спецыфічныя віды эканамічнай інфармацыі: *статыстычная, фінансавая, фондавая, біржавая, камерцыйная, кан'юнктурная* і інш.

Роля гістарычных крыніц у працэсе гістарычнага пазнання.

Адлюстраванне змястоўнага складу інфармацыйных рэсурсаў сцыяльна-гуманітарнай сферы ва ўніверсальных і спецыялізаваных класіфікатарах і рубрыкатарах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратура:

1.Антопольский, А. Б. Информационные ресурсы России: науч.-метод. пособие / А. Б. Антопольский. – Москва: Либерея, 2004. – 424 с. – Из содерж.: Гл. 12 : Информационные ресурсы системы образования. – С. 252–258 ; Гл. 13 : Информационные ресурсы государственной статистики. – С. 259–261 ; Гл. 14 : Система правовой информации. – С. 262–269 ; Гл. 15 : Информационные ресурсы органов власти. – С. 270–292 ; Гл. 20 : Информационные ресурсы в социальной сфере. – С. 368–377 ; Гл. 21 : Информационные ресурсы музеев. – С. 378–390.

2.Захарчук, Т.В. Інфармацыйныя рэсурсы для бібліятэк: вучэбна-практ. дапаможнік / Т. В. Захарчук. – СПб: Прафесія, 2011. – 126 с.

3. Знак, М.В. Новые формы обслуживания правовой информацией в Национальной библиотеке Беларуси / М. В. Знак, Н. А. Вишневская // Материалы III Международного конгресса "Библиотека как феномен культуры": чтение и информационная культура в современном обществе, Минск, 21–22 окт. 2015 г. / Нац. б-ка Беларуси; науч. ред. Р. С. Мотульский. – Минск, 2015. – С. 317–321.

4.Галіновыя інфармацыйныя рэсурсы: падручнік / рэд.: Р.С. Гілярэўскі, Т.В. Захарчук. – СПб.: Прафесія, 2015. – 415 с.

5.Гордукалова, Г. Ф. Информационные ресурсы гуманитарных наук: экономика. Вып. 1 : учеб. пособие / Г. Ф. Гордукалова ; С.-Петерб. гос. ун-т культуры и искусств. – Л., 2000. – 206 с.

6.Гордукалова, Г. Ф. Информационные ресурсы гуманитарных наук. Вып. 2. Информационные ресурсы в области истории, психологии, лингвистики : учеб. пособие / М. А. Мамонтов и др. ; С.-Петерб. гос. ун-т культуры и искусств. – Л., 2000. – 204 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Лекцыя 4.
## Дакументныя патокі ў галіне сацыяльна-гуманітарнай сферы

Дыферэнцыяцыя сацыяльна-гуманітарных дакументаў па мэтавым прызначэнні ажыццяўляецца:

– у дапамогу кіраўнічай дзейнасці:

дзяржаўнаму кіраванню (праватворчай, праваахоўнай, правапрымяняльнай дзейнасці);

у дапамогу кіраванню ў асобных галінах сацыяльнай дзейнасці;

у дапамогу навуковай дзейнасці (навукова-дапаможныя);

у дапамогу прафесійнай практычнай дзейнасці ў розных галінах сацыяльнай сферы (прафесійна-вытворчыя):

у дапамогу эканамічнай дзейнасці,

у дапамогу палітычнай дзейнасці,

у дапамогу педагагічнай дзейнасці,

у дапамогу журналісцкай дзейнасці,

у дапамогу выдавецкай, кнігагандлёвай дзейнасці,

у дапамогу бібліятэчнай, бібліяграфічнай, інфармацыйнай дзейнасці,

у дапамогу музейнай, архіўнай дзейнасці.

у дапамогу вучэбнай дзейнасці (вучэбна-дапаможныя);

у дапамогу самаадукацыйнай дзейнасці (рэкамендацыйныя);

у дапамогу грамадскай дзейнасці.

Кожная галіна ведаў мае свой уласны паток дакументаў, які дынамічна адлюстроўвае вынікі вывучэння яе гістрыі, тэорыі, метадалогіі. Найбольш значны аб'ём гістарычнай часткі мае паток літаратуры па філасофіі. У сацыялогіі і паліталогіі ядро тэарэтычных выданняў грунтуецца на аснове пошуку арыгінальных і фундаментальных аўтарсіх тэкстаў.Сучасныя інфармацйныя рэсурсы адлюстроўваюць складанасць узаемазвязаных сацыяльных працэсаў, таму істотнай з'яўляецца роля публікацый міжгаліновага характару, уключаючы кола часопісаў комплекснага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характару, праблемна-арыентаваных сайтаў, зборнікаў артыкулаў каферэнцый. Спецыфіка інфармацыйных рэсурсаў выражаецца ў значнасці для ўсіх груп карыстальнікаў даведачнай і вучэбнай літаратуры, патоку навін і аналітыкі аб палітычным жыцці ўсіх часоў, шырокім выкарыстанні сацыялагічных матэрыялаў, дэмаграфічнай статыстыкі, дасягненняў сацыяльнай псіхалогіі і інш.

Вучэбная, даведачная, навуковая і навукова-папулярная літаратура па філасофіі, сацыялогіі і паліталогіі, перыядычныя выданні.

Важнай часткай дакументнага патоку ў галіне *права* выступаюць інфармацыйныя рэсурсы, якія ажыццяўляюць афіцыйнае апублікаванне нарматыўна-прававых актаў.

Класіфікацыя прававых актаў па відах дазваляе вылучыць асноўныя з іх: Канстытуцыя, законы, указы і распарадэнні Прэзідэнта, пастанаўленні і распараджэнні ўрада, ведамасныя акты (міністэрстваў, камітэтаў), акты мясцовага самакіравання, рашэнні судовых органаў, палажэнні, уставы і рэгламенты, нарматыўныя дагаворы, праграмы, дэкларацыі і інш.

Крыніцы афіцыйнага апублікавання нарматыўна-прававых актаў.

Зборнік прававых актаў – Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь створаны і функцыянуе з 1 студзеня 1999 года згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 1998 года № 369 «О Национальном реестре правовых актов Республики Беларусь» і ўяўляе сабой сістэму ўліку прававых актаў Рэспублікі Беларусь. Статус Нацыянальнага рэестра, парадак яго фарміравання і вядзення вызначаны Палажэннем аб Нацыянальным рэестры прававых актаў Рэспублікі Беларусь, зацверджаным названым Указам. Вядзенне Нацыянальнага рэестра ажыццяўляецца Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь (НЦПІ).

Перыядычныя выданні: «Веснік Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь», «Судовы веснік», «Юстиция Беларуси», «Проблемы управления», «Законность и правопорядок», «Государственный контроль: анализ,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

практика, комментарии», «Информационный бюллетень Администрации Президента Республики Беларусь», «Трудовое и социальное право» і інш.

Дакументны паток у галіне *эканомікі* мае тэндэнцыю зніжэння тэмпаў росту патока друкаваных выданняў і павелічэння долі электронных інфармацыйных рэсурсаў featureзнага віду. Выраслі тэмпы старэння эканамічнай літаратуры.

Перыядычныя выданні па эканоміцы Расіі, Беларусі: “Вопросы экономики”, “Российский экономический журнал”, “Поблемы прогнозирования”, “Экономист”, “Банкаўскі веснік”, “Банковское дело”, “Белорусский экономический журнал”, “Бухгалтерский учет и анализ” і інш. Замежныя перыядычныя выданні па эканоміцы.

Асаблівасцю дакументнага патоку ў педагогіцы з’яўлеяецца адносна доўгі полуперыяд старэння дакументаў і значнае рассеянне артыкулаў у перыядычных выданнях. У дакументным патоку шырока прадстаўлены вучэбная і прафесійна-метадычная літаратура, значная доля агульнапрафесійных дыдактычных матэрыялаў, а таксама спецыялізаваных выданняў даведачнай і мастацкай літаратуры.

Аб’ем дакументнага патоку па псіхалогіі ў апошнія дзесяцігоддзі расце хуткімі тэмпамі. Гэта завязана з тым, што псіхалагічная інфармацыя цікавіць шырокія групы карыстальнікаў. Для гэтай сферы характэрна значнае рассеянне інфармацыі па крыніцах сумежных галін (педагогіка, філасофія, сацыялогія, медыцына). Старэнне літаратуры па псіхалогіі працягваецца дастаткова працяглы час, перыяд старэння галіновых дакументаў складае 12-14 год.

У патоку дакументаў па гісторыі і гістарычных навуках перавагу маюць навукова-папулярныя выданні, арыентаваныя на масавага чытача. Многія з гэтых выданняў выходзяць у свет серыямі (“Жизнь замечательных людей”, “Исторические факты и литературные версии”, “Великая забытая война, “100 великих”, “Страницы истории” і інш.). Узрасла колькасць выпускаемых дапаможнікаў па гісторыі для навучальных устаноў. Новыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падыходы да гістарычнай навукі дыктуюць неабходнасць істотных перапрацовак вучэбных праграм і методыкі выкладання дысцыплін гістарычнага цыклу. Вельмі шырокі ахват выпуску даведачнай літаратуры, у тым ліку біяграфічных слоўнікаў, даведнікаў, энцыклапедый і інш. Выдаецца даведачная літаратура па дапаможным гістарычным дысцыплінам (генеалогіі, геральдыцы, гістарычнай геаграфіі, храналогіі). Вялікая роля перыядычных выданняў: “Беларуски гістарачны часопіс”, “Вопросы истории”, “Новая и новейшая история”, “Археология”, “Этнографичесое обозрение” і інш.

Выдавецкая структура дакументных патокаў розных галін сацыяльна-гуманітарнай сферы; роля спецыялізаваных выдавецтваў, навукова-даследчых інстытутаў, установ вышэйшай адукацыі, грамадскіх аб’яднанняў і інш. у фарміраванні дакументных патокаў розных галін сацыяльна-гуманітарнай сферы.

Па філасофіі: роля ўніверсальных і спецыялізаваных навуковых выдавецтваў “Либроком”, “Эксмо”, “София”, “Весь” , “Феникс» і інш.; выдавецкія арганізацыі вузаў: філасофскіх кафедр Маскоўскага, Санкт-Пецярбургскага, Навасібірскага і інш. універсітэтаў.

Па сацыялогіі: роля ўніверсальных выдавецтваў “Наука”, «Научная книга», «Инфа-М», «АСТ» (да 2013г.), «Феникс» і інш.

Па паліталогіі: выдавецтвы ўніверсітэтаў (МДІМА, БДУ і інш.), спецыялізіраванае выдавецтва “Российская политическая энциклопедия” і інш.

Па праву: дзейнасць выдавецтваў “Юридическая литература”, “Инфа-М”,“СТАТУТ”, “Норма” і інш.

Па эканоміцы: дзейнасць вядучых спецыялізаваных выдавецтваў “Экономика”, “Финансы и статистика”, “Международные отношения”, “Учёт”, “Креативная экономика”, “Экономическая школа” і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па педагогіцы: выдавецтвы “Просвещение”, “Дрофа”, “Академия”, “Адукацыя і выхаванне”, “Беларуская навука”, “Вышэйшая школа”, “Белы вецер” і інш.

Літаратура:

1.Гордукалова, Г. Ф. Документальный поток социальной тематики как объект библиографической деятельности : учебное пособие / Г. Ф. Гордукалова. – Ленинград : ЛГИК, 1990.– 108 с.

2.Захарчук, Т.В. Інфармацыйныя рэсурсы для бібліятэк: вучэбна-практ. дапаможнік / Т. В. Захарчук. – СПб: Прафесія, 2011. – 126 с.

3.Галіновыя інфармацыйныя рэсурсы: падручнік / рэд.: Р.С. Гілярэўскі, Т.В. Захарчук. – СПб.: Прафесія, 2015. – 415 с.

4. Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь [Электроннный ресурс]. – Режим доступа : pravo.by. – Дата доступа : 1.10.2018.

## Лекцыя 5.

## Спецыфіка электронных інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы

Дастатовая вялікая колькасць інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы прадстаўлена ў элетронным асяродку, карыстальнікам інфармацыі важна ўмець выкарыстоўваць іх у прафесійнай дзейнасці.

Карысныя інфармацыйныя рэсурсы па сацыялогіі, філасофіі і паліталогіі размешчаны на наступныхінтэрнэт-рэсурсах:

– афіцыйныя сайты ўстаноў, прафесійна працуючых у прадметнай воблаці і ствараючых новую інфармацыю па тэме;

– асабістыя сайты вядучых аўтараў і спецыялістаў галіны;

– тэматычныя сайты адпаведнага мэтавага і чытацага прызначэння;

– сайты рэдакцый галіновай перыёдыкі, дзе размешчаны архівы апублікаваных дакументаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- сайты, якія прадстаўляюць доступ да поўнатэкставых баз дадзеных, электронных калекцый, бібліяграфічных рэсурсаў;
- спецыялізіраваныя парталы, утрымліваючыя масівы даведачнай, аналітычнай і інш. інфармацыі па профілю;
- электронныя бібліятэкі і калекцыі публікацый па тэме;
- сайты выдавецтваў і кніжных інтэрнэт-магазінаў пры з'яўленні новых выданняў.

Для ажыццяўлення эфетыўнага пошуку ў электронным асяродку неабходна дастаткова добра арыентавацца ў аўтарксай структуры патоку, ведаць вядучых спецыялістаў галіны, сетку даследчых арганізацый, пералік важнейшых галіновых перыядычных выданняў і г.д.

Прававыя інфармацыйныя рэсурсы ў сетцы Інтэнэт прадстаўлены вельмі шырока, іх можна класіфікавць наступным чынам:

- *Эталонны банк дадзеных* прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь (ЭБДПІ) – асноўны дзяржаўны інфармацыйна-праавы рэсурс, які фарміруецца і вядзецца Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь і ўяўляе сабой сукупнасць банкаў дадзеных «Заканадаўства Рэспублікі Беларусь», «Рашэнні органаў мясцовага кіравання і самакіравання», «Міжнародныя дагаворы». ЭБДПІ ўключае звыш 200 000 прававых актаў;
- *Інфармацыйна-прававыя базы дадзеных* (Гарант, КансультантПлюс, Кодэкс і інш.). Яны дазваляюць кампактна захоўваць вялікія аб'ёмы інфармацыі, з неабходнай перыядычнасцю актуалізаваць прадстаўляемую інфармацыю, ажыццяўляць аператыўны пошук патрэбных дакументаў і іх фрагментаў у вялікіх масівах дадзеных;
- *Электронныя бібліятэкі*, уключаючыя поўныя тэксты выданняў прававой тэматыкі (“Правовая библиотека” у расійскім сегменце налічвае звыш 300 поўных тэксаў прававой тэматыкі). Вялікае значэнне для карыстальнікаў прававой інфармацыі маюць архівы замежных элетронных бібліятэк;
- *Прававыя СМІ;*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– *Тэматычныя сайты* па праву ствараюцца прафесійнымі юрыстамі і ўтрымліваюць матэрыялы па розных прававых пытаннях і праблемах;
– *Юрыдычныя фірмы;*
– *Прававыя форумы;*
– *Вэб-старонкі вядомых юрыстаў* (персанальныя старонкі);
– *Юрыдычныя блогі* і інш.

Нягледзячы на вялікую колькасць прадстаўленых у электронным асяродку інфармацыйных рэсурсаў па праву, самымі запатрабаванымі з’яўляюцца даведачна-прававыя інфармацыйныя сістэмы.

Электронныя інфармацыйныя рэсурсы па эканоміцы прадстаўлены электроннымі энцыклапедыямі, даведнікамі, перыядычнымі выданнямі, БД эканамічнай тэматыкі, сайтамі буйных інфармацыйна-аналітычных цэнтраў, якія выстаўляюць дзелавыя навіны, агляднa-аналітычную прадукцыю.

Электронныя рэсурсы ліквідуюць многія прабелы выдавецкага рынку. Сярод стабільных крыніц поўнатэкставай эканамічнай інфармацыі можна адзначыць электронныя бібліятэкі, парталы ўніверсальнага і сайты галіновага характару, якія забяспечваюць доступ да масіву эканамічных СМІ, лентам навін і інш.

Шырокае кола стваральнікаў электронных інфармацыйных рэсурсаў па эканоміцы: органы дзяржаўнага, галіновага кіравання, рэдакцыі часопісаў і газет, інфармацыйныя службы і кансалтынгавыя фірмы, прадпрыемствы, банкі, камерцыйныя фірмы, асацыяцыі, аб’яднанні прадпрымальнікаў і інш. Электронныя інфармацыйныя рэсурсы, створаныя імі, вельмі разнастайныя: базы дадзеных, бюлетэні, нарматыўныя акты, справаздачна-планавая, статыстычная інфармацыя, рэгістры гаспадарчых аб’ектаў, агляднааналітычная інфармацыя, дзелавыя навіны, фактаграфічная і аналітычная інфармацыя кан’юнктурнага характару, рэкламная, крэдытная, фінансавая і інш. інфармацыя.

Карысныя звесткі фактаграфічнага характару могуць быць значна рассеянымі сярод вялікай колькасці элетронных дакументаў. Таму пры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пошуку неабходна суаднесці іх з пэўнай разнавіднасцю эанамічнай інфармацыі, удакладніць геаграфічныя, часавыя, змястоўный межы стварэння і апублікавання неабходных дадзеных.

Адукацыйныя інфармацыйныя рэсурсы займаюць значнае месца сярод агульнай сукупнасці педагагічных іфармацыйных рэсурсаў. Паколькі адукацыя ў сучасным грамадстве – гэта непрырыўны працэс, то для розных катэгорый навучэнцаў патрабуюцца розныя віды адукацыйных рэсурсаў. Да найбольш запатрабаваных можна аднесці бібліятэчныя адукацыйныя рэсурсы, а таксама рэсурсы дзяржаўных адукацыйны парталаў (https://adu.by/ru/ Нацыянальны адукацыйны партал Рэспублікі Беларусь і інш.).

З 2002 года  ЮНЕСКА актыўна падтрымлівае ініцыятывы па распаўсюджванні ў Інтэнэт адкрытых адукацыйных рэсурсаў – размешчаных у адкрытым доступе матэрыялаў, якія неабходны для выкарыстання ў працэсе адукацыі. Такія інфармацыйныя рэсурсы могуць уключаць у сябе розныя элементы: поўны элетронны курс навучання, метадычныя матэрыялы, вучэбныя модулі, відэа- і аўдыяматэрыялы, тэсты, заданні і інш.

Істотнай праблемай з'яўляецца інтэграцыя інтэрнэт-рэсурсаў, размешчаных на адукацыйных парталах, на сайтах навучальных установаў, у электронных бібліятэках і калекцыях. У апошні час надаецца вялікая ўвага сістэматызацыі адукацыйных электронных рэсурсаў.

Літаратура:

1. Березкина, Н.Ю. Создание и использование электронных информационных ресурсов в библиотеках Беларуси / Н. Ю. Березкина, Л. А. Авгуль, Б. Б. Невский. – Минск: Красико-Принт, 2002. – 143 с.
2. Васькова, Н. И. Электронные источники правовой информации : учеб.-метод. пособие / Н. И. Васькова, М. В. Салменкова. – Москва : ЛИБЕРЕЯ–БИБИНФОРМ, 2006. – 114 с.
3. Галіновыя інфармацыйныя рэсурсы: падручнік / рэд.: Р.С. Гілярэўскі, Т.В. Захарчук. – СПб.: Прафесія, 2015. – 415 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Грузнова, Е. Б. Деятельность Президентской библиотеки по информационному обеспечению исторической науки, образования и просвещения в электронной среде / Е.Б.Грузнова // Роль библиотек в информационном обеспечении исторической науки : сборник статей / авт.-сост. Е. А. Воронцова ; отв. ред. А. О. Чубарьян, В. Р. Фирсов. – М. : Этерна, 2016. – С. 293–302.

5. Захарчук, Т.В. Інфармацыйныя рэсурсы для бібліятэк: вучэбна-практ. дапаможнік / Т. В. Захарчук. – СПб: Прафесія, 2011. – 126 с.

6. Матвеева, Е. Ю. Библиографическая база данных по истории, археологии и этнологии автоматизированной информационной системы по общественным наукам (АИСОН) ИНИОН РАН / Е.Ю. Матвеева // Роль библиотек в информационном обеспечении исторической науки : сборник статей / авт.-сост. Е. А. Воронцова ; отв. ред. А. О. Чубарьян, В. Р. Фирсов. – М. : Этерна, 2016. – С. 309–328.

7.Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь [Электроннный ресурс]. – Режим доступа : pravo.by. – Дата доступа : 1.10.2018.

8. Шемберко, Л. В.Библиографическая база данных по социологии: принципы и инструменты формирования, структура, особенности поиска / Шемберко Л. В., Слива А. И. // Научно-техническая информация. Серия 1: Организация и методика информационной работы. – 2015. – № 10. – С. 21–30.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РАЗДЗЕЛ ІІ. АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ СТРУКТУРА ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНАЙ СФЕРЫ

### Лекцыя 6.

### Арганізацыя фарміравання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ў замежных краінах

Арганізацыяй фарміравання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ў Расійскай Федэрацыі і іншых краінах СНД займаюцца розныя ўстановы.

*Парламенцкая бібліятэка* Расіі з'яўляецца стуктурным падраздзяленнем Апарата Дзяржаўнай Думы Расійскай Федэрацыі. Галоўнай мэтай дзейнасці выступае арганізацыя карыстання кнігамі, серыяльнымі выданнямі, афіцыйнымі дакументамі і інш. па пытаннях права і парламентарызма, а таксама блізкіх да іх сфер для ўсебаковага бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання членаў Савета Федэрацыі, дэпутатаў Дзяржаўнай Думы, супрацоўнікаў апарата палат, экспертаў.

Парламенцкая бібліятэка забяспечвае камплектаванне абавязковага экзэмпляра афіцыйных дакументаў РФ, вядзе падрыхтоўку бібліяграфічнай і статыстычнай інфармацыі афіцыйных дакументаў, арганізацыю іх выкарыстання; форміруе фонд парламенцкіх дакументаў замежных краін, дакументаў палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў грамадзян, даведачнай літаратуры, перыёдыкі і іншых публікацый у галіне права і парламентарызма. Кожны дзень праводзіцца аналітычная апрацоўка паступіўшых у бібліятэку выданняў, ствараецца даведачна-бібліяграфічны апарат да іх, фарміруюцца аўтаматызааныя бібліяграфічныя і фактаграфічныя базы дадзеных, рыхтуюцца аглядныя матэрыялы, дайджэсты прэсы, аналітычныя і бібліяграфічныя выданні з улікам інфармацыйных патрэбнасцей і запытаў карыстальнікаў. Дзейнасць бібліятэкі накіравана на прадстаўленне інфармацыйных паслуг: выдачу даведак, першасных крыніц інфармацыі, бібліяграфічны і фактаграфічны пошук у базах дадзеных, падрыхтоўку інфармацыйных пакетаў да парламенцкіх слуханняў і падбор аналітычных матэрыялаў да разглядаемых законапраектаў.

Парламенцкая бібліятэка з'яўляецца членам Міжнароднай Федэрацыі бібліятэчных асацыяцый і актыўна ўдзельнічае ў рабоце секцыі парламенцкіх бібліятэк і даследаванняў для парламента.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Прэзідэнцкая бібліятэка ім. Б.М.Ельцына* – электронная нацыянальная бібліятэка Расіі. Яна функцыянуе як агульнадзяржаўнае электроннае сховішча цыфравых копій важнейшых дакументаў па гісторыі, тэорыі і практыцы расійскай дзяржаўнасці, рускай мове, а таксама як культурна-асветніцкі, навукова-адукацыйны і інфармацыйна-аналітычны цэнтр. Бібліятэка фарміруе электронны рэсурс, які складаюць цыфравыя копіі друкаваных кніг, перыядычных выданняў, архіўных крыніц, афіцыйных дакументаў, фотаздымкаў, карт, атласаў і інш. Сярод унікальных помнікаў – Лаўрэнцьеўскі летапіс, Астрамірава Евангелле, Азбука грамадзянская з натацыямі і пазнакамі Пятра I і інш.

Электронны фонд Прэзідэнцкай бібліятэкі ім. Б.М.Ельцына фарміруецца ва ўзаемадзеянні з нацыянальнымі, цэнтральнымі галіновымі і рэгіянальнымі бібліятэкамі, федэральнымі і рэгіянальнымі архівамі і музеямі Расіі, вучэбнымі ўстановамі, органамі ўлады, СМІ, грамадскімі арганізацыямі і прыватнымі асобамі. У цыфравым фондзе бібліятэкі прадстаўлена больш 550 000 дакументаў, 140 000 з іх знаходзяцца ў адкрытым доступе на інтэрнэт-партале.

*Інстытут навуковай інфармацыі па грамадскіх навуках Расійскай акадэміі навук* (ІНІГН РАН) выконвае важную ролю ў фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы. З’яўляецца буйнейшым цэнтрам навуковай інфармацыі і шматпрофільным навукова-даследчым інстытутам у галіне сацыяльных і гуманітарных навук. ІНІГН займаецца падрыхтоўкай і выданнем серый бібліяграфічных, рэфератыўных і аналітычных выданняў, ажыццяўляе навуковыя даследаванні па правазнаўстве, палітычным навукам, гісторыі, эканоміцы, сацыялогіі, сацыяльнай псіхалогіі, філасофіі, культуралогіі, мовазнаўстве, рэгіёназнаўстве, глабальным праблемам чалавецтва, афрыканістыцы, навуказнаўстве і інш.

*Дзяржаўная публічная гістарычная бібліятэка* Расіі ў фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў ў галіне гісторыі. З 2014 г. у склад бібліятэкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўваходзіць філіял – Цэнтр сацыяльна-палітычнай гісторыі, створаны на аснове рэарганізацыі Дзяржаўнай грамадска-палітычнай бібліятэкі. Фонды бібліятэкі складаюць каля 4 млн. экзэмпляраў, дастаткова поўна сабрана дарэвалюцыйная і амаль поўнасцю савецкая літаратура па гісторыі Расіі (СССР), сусветнай гісторыі і гісторыі замежных краін. Бібліятэка вядома не толькі як навуковы цэнтр спецыяльнага профілю, але і як установа, якая вядзе актыўную выдавецкую дзейнасць, заснаваную на багацці ўласных фондаў. Перавыдаюцца гістарычныя крыніцы, выпускаюцца спецыяльныя зборнікі, утрымліваючыя тэарэтычныя і метадычныя распрацоўкі і пытанні гістарычнай бібліяграфіі.

На аснове ацыфраваных фондаў ДПГБ Расіі функцыянуе электронная бібліятэка, якая ўяўляе сабой збор дакументаў і матэрыялаў па сусветнай і расійскай гісторыі, генеалогіі і геральдыцы, гісторыі ваеннай справы, этнаграфіі Расіі.

*Навуковая педагагічная бібліятэка ім. К.Д.Ушынскага* з'яўляцца буйнейшай у Расіі бібліятэкай па педагогіцы, псіхалогіі, адукацыі, міжнародны дэпазітарый ЮНЕСКА па літаратуры ў галіне педагогікі і адукацыі. Фонд бібліятэкі ўключае літаратуру гістарычнага, тэарэтычнага і практычнага харатару па педагогіцы, адукацыі, псіхалогіі, дыфекталогіі і смежным навукам , якая выйшла на тэрыторыі Расіі , а такасама літаратуру на 39 замежных мовах. У фондах бібліятэкі прадстаўлены падручнікі і дапаможнікі для школ, праграмы, кнігі для чытання, метадычныя матэрыялы расійскай дарэвалюцыйна і сучаснай школы. Асобную цікавасць выклікае фонд даведачных і бібліяграфічных выданняў па педагагічным навукам. Дарэвалюцыйная бібліяграфія прадстаўлена выданнямі С.І.Анцыферава, К.Н. Дзерунова, А.М.Лебедзева, В.І. Мяжова, М.А.Рубакіна і інш.У бібліятэцы вядзецца БД аўтарэфератаў па педагогіцы і народнай адукацыі.

Інфармацыйныя рэсурсы па педагогіцы і псіхалогіі *Фундаментальнай бібліятэкі імператрыцы Марыі Фёдараўны РДПУ ім. Герцэна,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Фундаментальнай бібліятэкі Маскоўскага гарадскога педагагічнага ўніверсітэта, РДБМ, РГДБ.*

Інфармацыйныя рэсурсы па праву фарміруюць *Публічныя цэнтры прававой інфармацыі* (ПЦПІ) на базах бібліятэк.

Інфармацыйныя рэсурсы па эканоміцы – ІНІГН , ВІНІТІ РАН, ГПНТБ Расіі, ГПНТБ СА РАН, спецыялізаваныя фонды па эканоміцы маюць акадэмічныя НДІ – Інстытут эканомікі РАН, Інстытут сацыяльна-эканамічных праблем народанасельніцтва, галіновыя і недзяржаўныя НДІ і цэнтры – Інстытут мікраэканомікі, інстытут макраэанамічых даследванняў і інш.

Літаратура:

1. Виноградов, В. А. Роль научной информации в развитии наук об обществе и человеке: итоги и перспективы деятельности ИНИОН РАН [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.eterna-izdat.ru/books/test/9785480002447.pdf. – Дата доступа : 20.04.2017.
2.Захарчук, Т.В. Інфармацыйныя рэсурсы для бібліятэк: вучэбна-практ. дапаможнік / Т. В. Захарчук. – СПб: Прафесія, 2011. – 126 с.
3. Галіновыя інфармацыйныя рэсурсы: падручнік / рэд.: Р.С. Гілярэўскі, Т.В. Захарчук. – СПб.: Прафесія, 2015. – 415 с.
4. Мелентьева, Ю. П. Публичные центры правовой информации: новые возможности библиотечного обслуживания / Ю. П. Мелентьева. – Москва: ФАИРПРЕСС, 2004. – 96 с.
5. Никитов, В. А. Информационное обеспечение государственного управления / В. А. Никитов [и др.] ; под ред. Ю. В. Гуляева. – Москва: Славянский диалог, 2000. – 415 с. – Из содерж.: 3.4. Место и роль Парламентской библиотеки Российской Федерации в системе информационного обеспечения законодательной деятельности. – С. 199-204.
6.Опыт деятельности Государственной научно-педагогической библиотеки Украины имени В. А. Сухомлинского по информационно-библиографическому обеспечению научных исследований Национальной

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

академии педагогических наук Украины / Самчук Л. И. // Информационные технологии и средства обучения. – 2015. – Т. 45. – № 1. – С. 176-186.
7.Роль библиотек в информационном обеспечении исторической науки : сборник статей / авт.-сост. Е. А. Воронцова ; отв. ред. А. О. Чубарьян, В. Р. Фирсов. – М. : Этерна, 2016. – 672 с.

## Лекцыя 7.
## Арганізацыя фарміравання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь

Сетка ўстаноў Рэспублікі Беларусь, якія спецыялізуюцца на стварэнні інфармацыйных рэсурсаў розных галін сацыяльна-гуманітарнай сферы і сацыяльна-гуманітарных навук: права; эканомікі; палітыкі; ваеннай справы; культуры; навукі; адукацыі; духоўна-рэлігійнай сферы.

*Нацыянальная бібліятэка Беларусі.*

*Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь.*

*Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*, іншыя рэспубліканскія навуковыя бібліятэкі як цэнтры фарміравання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы.

Роля бібліятэк рэгіянальнага і нізавога ўзроўняў (абласных бібліятэк, раённых і гарадскіх цэнтралізаваных сістэм публічных бібліятэк), бібліятэк устаноў вышэйшай адукацыі і навукова-даследчых інстытутаў, бібліятэк грамадскіх аб'яднанняў у інфармацыйна-бібліяграфічным забеспячэнні сацыяльна-гуманітарнай сферы.

Роля *Нацыянальнай кніжнай палаты, Беларускага інстытута сістэмнага аналізу (БелІСА)* у галіне бібліяграфічнага забеспячэння сацыяльна-гуманітарнай сферы. *НДРУП "Інстытут прыкладных праграмных сістэм"* як цэнтр дзяржаўнай рэгістрацыі інфармацыйных рэсурсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Роля *Нацыянальнага і іншых цэнтраў прававой інфармацыі* у фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы.

Арганізацыйнае ўзаемадзеянне цэнтраў фарміравання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь.

Літаратура:


1. Агеева, Е. Президентская библиотека Республики Беларусь и органы государственной власти: история 80-летнего сотрудничества / Елена Агеева // Бібл. свет. – 2013. – № 6.– С. 6–7.

2. Калужонок, Н. В. Деятельность публичных центров правовой информации по формированию правовой культуры граждан (на примере Центральной библиотеки имени Ф. Скорины Полоцкой районной централизованной библиотечной системы) / Н. В. Калужонок // Право.by. – 2016. – № 1. – С. 116–118.

3.Кузьмініч, Т. В. Нацыянальная бібліятэка Беларусі як цэнтр бібліяграфіі па айчыннай гісторыі / Кузьмініч Т.В. // Здабыткі: Дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі. – Минск., 2004. – Вып. 6. – С. 6-20.

4.Православная библиотека: основы организации работы / сост. : Н. Б. Ветошкина, Т. А. Самойлюк, И. В. Уржинская ; под общ. ред. И. В. Уржинской. – Минск.: Ковчег, 2004. – 126 с.

5. Соболевская, О. Церковные библиотеки в информационном пространстве Беларуси // Бібл. свет. – 2013.– № 1. – С. 15–17.

6. Сятковская, Н. Библиотека Белорусского государственного педагогического университета им. М. Танка / Надежда Сятковская // Библ. свет. – 2014. – № 6. – С. 20–22.


## Лекцыя 8.

## Міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне фарміравання і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Роля Міжнароднай федэрацыі бібліятэчных асацыяцый (ІФЛА) і яе секцый у арганізацыі міжнароднага супрацоўніцтва бібліятэк у галіне фарміравання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы.

Пасля першай сусветнай вайны ўзнікла неабходнасць устанаўлення прафесійных сувязяў і кантактаў паміж рознымі краінамі ў галіне бібліятэчнай справы. Значную падтрымку міжнароднаму супрацоўніцтву аказваў створаны ў 1895 г. у Брусселі па ініцыятыве Поля Атле *Міжнародны бібліяграфічны інстытут*, які ініцыіраваў распрацоўку УДК, праект бібліяграфічнай рэгістрацыі артыкулаў у навуковых часопісах або праект стварэння Універсальнага бібліяграфічнага рэпертуару. У 1931 г. Міжнародны бібліяграфічны інстытут пераймeнаваны ў Міжнародны інстытут дакументацыі, а ў 1937г. – у Міжнародную федэрацыю па дакументацыі – *ФІД*.

У 1927 г. на канферэнцыі Бібліятэчнай асацыяцыі ў Эдынбургу, прысвечанай яе 50-годдзю, было прапанавана стварыць *Міжнародную федэрацыю бібліятэчных асацыяцый* (*ІФЛА*). Першы кангрэс ІФЛА быў праведзены ў 1929 г. у Італіі, у якім прымалі ўдзел і прадстаўнікі з СССР.

Другая сусветная вайна прынесла значныя страты бібліятэкам і бібліятэчным фондам. У 1943 г. у Маскве быў створаны Дзяржаўны фонд літаратуры, які займаўся папаўненнем савецкіх бібліятэк, якія панеслі страты ў гады вайны. У 1944 г. Л.Б. Хаўкіна заклікала да вывучэння замежнага вопыту на навуковым узроўні. Аднак з канца 1940-х у 1950-я гады наступіў перыяд "халоднай вайны", бібліятэкі і бібліятэчная справа былі ўцягнуты ў гэты працэс. Савецкія друкаваныя матэрыялы яшчэ з 1944 г. праходзяць асобую рэгістрацыю ў Бібліятэцы Кангрэса ЗША, якая супрацоўнічае з ФБР. Асаблівасць "халоднай вайны" – актыўнае насаджэнне свайго бібліятэчнага вопыту, якое было характэрна для ЗША і СССР. У "хрушчоўскую адлігу" (з сярэдзіны 1960-х гг.) сітуацыя мяняецца і ў першую чаргу ў галіне міжнароднага супрацоўніцтва. Пачынае выходзіць зборнік "Библиотековедение и библиография за рубежом", які выдае Дзяржаўная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэка СССР імя У.І.Леніна. Рэдагаваўся зборнік у навуковым цэнтры па вывучэнні замежнага вопыту. Актывізаваліся міжнародныя навуковыя канферэнцыі і семінары. Падчас хрушчоўскай “адлігі” чытачы змаглі пазнаёміцца з перакладнымі выданнямі заходнееўрапейскай і амерыканскай літаратуры, а таксама прачытаць першыя публікацыі А.Салжаніцына і іншых будучых дысідэнтаў. У гэты час была разгорнута вайна з рэлігіяй, у выніку якой амаль усе рэлігійныя выданні сталі недаступнымі для масавага чытача. У брэжнеўскі час разам з інтэнсіўным развіццём бібліятэчнай сеткі назіраецца аднабаковы падыход да камплектавання бібліятэчных фондаў. Актыўна працаваў Галоўліт, друкаваліся спісы забароненай літаратуры, ішла вайна з дысідэнцкай літаратурай. Адчувальныя змены ў сферы бібліятэчнай дзейнасці пачаліся напярэдадні 1989 г. і пэўнай кропкай адліку новага часу ў жыцці еўрапейскіх бібліятэк стала разбурэнне Берлінскай сцяны.

Для нацыянальных бібліятэк адкрываецца магчымасць рэальнай інтэрграцыі ў сусветныя бібліятэчныя працэсы. У 1989 г. створана Ленінградскае, цяпер Пецярбургскае бібліятэчнае таварыства і Маскоўскае бібліятэчнае таварыства. У пачатку 1990-х гадоў ствараюцца Расійская бібліятэчная асацыяцыя, Беларуская бібліятэчная асацыяцыя (у 1992 г.). Прымаюцца законы аб бібліятэчнай справе (у Расіі ў 1994 г., у Беларусі – у 1995 г. быў прыняты Закон “Аб бібліятэчнай справе Рэспублікі Беларусь”). Ліквідуецца цэнзура і адкрываюцца спецфонды, бібліятэкі атрымліваюць права на падпіску любых перыядычных выданняў незалежна ад іх палітычнага накірунку. Значную ролю ў дэмакратызацыі бібліятэчнай справы адыграла сістэма Інтэрнет.

*Міжнароднае бібліятэчна-бібліяграфічнае супрацоўніцтва.* Пасля другой сусветнай вайны назіраецца ўзмацненне актыўнасці навуковых бібліятэк у пошуку шляхоў *кааперацыі.* У 1946 г. у рамках ААН была створана Арганізацыя Аб’яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры – ЮНЕСКА, штаб-кватэра якой размясцілася ў Парыжы. Першыя праекты і праграмы ЮНЕСКА па бібліятэчнай справе тычыліся дапамогі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяржавам-членам ЮНЕСКА ва ўзнаўленні знішчаных у час вайны бібліятэк. У 1974 г. былі распрацаваны рэкамендацыі па стварэнні нацыянальных сістэм інфармацыі – НАТІС. Праграмы НАТІС і ЮНІСІСТ сталі новым этапам дзейнасці ЮНЕСКА. Іх ажыццяўленне садзейнічае арганізацыі служб дакументацыі, бібліятэк, архіваў на нацыянальнай, рэгіянальнай і міжнароднай аснове.

З 1992 г. ЮНЕСКА ажыццяўляе праграму “Памяць свету” па ахове і прапагандзе сусветнай дакументальнай спадчыны. Мэта праграмы – стварэнне новых падыходаў да аховы дакументальнай спадчыны, дэмакратызацыя доступу да яе, забеспячэнне больш шырокіх ведаў аб значнасці гэтай спадчыны і неабходнасці яе захавання. На падставе Праграмы “Памяць свету” распрацоўваюцца нацыянальныя праграмы – “Памяць Расіі”, Памяць Беларусі” і інш.

У 1947 г. узнавіла сваю дзейнасць Міжнародная федэрацыя бібліятэчных асацыяцый ІФЛА (падрабязная інфармацыя пра ІФЛА на яе сайце – www.ifla.org) – незалежная міжнародная арганізацыя, якая мае афіцыйны кансультатыўны статус у ЮНЕСКА. Яе мэты – пашырэнне міжнароднага ўзаемаразумення, супрацоўніцтва, развіцця навуковых даследаванняў ва ўсіх галінах бібліятэчнай дзейнасці і інфарматыкі. Адной з асноўных праграм ІФЛА – праграма Універсальнага бібліяграфічнага ўліку (УБУ), створана таксама праграма па ўсеагульнай даступнасці выданняў – ЮАП. Вялікай увагі заслугоўвае праграма ІФЛА “Захаванасць і кансервацыя” (ПАК), распрацаваная ў 1980-я гг., накіраваная на міжнародную каардынацыю дзейнасці бібліятэк. Мэта праграмы – размеркаванне абавязкаў паміж бібліятэкамі па захаванасці фондаў. ІФЛА распрацаваны адзіныя правілы і міжнародныя стандарты каталагізацыі твораў друку, адзіныя правілы Міжнароднага міжбібліятэчнага кнігаабмену (ММБА). ІФЛА супрацоўнічае з ФІД і ІСО.

У 1944 г. на аснове Міжнароднай федэрацыі нацыянальных асацыяцый па стандартызацыі быў створаны Камітэт Аб’яднаных Нацый па каардынацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

распрацоўкі стандартаў. У 1946 г. перайменаваны ў Міжнародную арганізацыю па стандартызацыі – ІСО. Асноўная мэта ІСО – садзейнічанне стандартызацыі ў сусветным маштабе для аблягчэння міжнароднага тавараабмену і ўзаемадапамогі, а таксама для пашырэння супрацоўніцтва ў галіне інтэлектуальнай, навуковай, тэхнічнай і экалагічнай дзейнасці. Адным з дасягненняў ІСО з'яўляецца распрацоўка Міжнароднай стандартнай сістэмы індэксавання кніг ISBN. У адпаведнасці са статутам ІСО членамі яе з'яўляюцца нацыянальныя арганізацыі па стандартызацыі (з 1993 г. – Беларусь). Асноўны від публікацый ІСО – стандарты, перыядычныя выданні.

Актыўнае ўкараненне новых інфармацыйных тэхналогій у практыку работы бібліятэк дазволіла атрымаць магчымасць доступу да інфармацыйных рэсурсаў замежных бібліятэк. У 1990-я гг. многія нацыянальныя бібліятэкі перайшлі да рэалізацыі маштабных праектаў па стварэнні лічбавых аналагаў сваіх калекцый. Сучасны этап – гэта этап развіцця бібліятэк ва ўмовах глабальнай інфарматызацыі.

Бібліятэка ААН і сетка дэпазітарных бібліятэк ААН у краінах свету.

Цэнтр дакументацыі па сацыяльных і гуманітарных навуках і Міжнароднае бюро асветы ЮНЕСКА.

Міжнародныя бібліяграфічныя праекты Бібліятэчнай Асамблеі Еўразіі.

Удзел бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў Беларусі ў міжнародным супрацоўніцтве ў галіне фарміравання і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратура:

1. Абрамов, К.И. История библиотечного дела в СССР: учебник / К.И. Абрамов. – Москва: Книга, 1980. – 354 с.

2. Володин, Б.Ф. Всемирная история библиотек: монография / Б.Ф.Володин. – 2-е изд., доп. - СПб.: Профессия, 2004. - 432 с.

# РАЗДЗЕЛ III. ІНФАРМАЦЫЙНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ РЭСУРСЫ САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНАЙ СФЕРЫ

## Лекцыя 9.

## Інфармацыйна-бібліяграфічныя рэсурсы сацыяльна-гуманітарнай сферы Рэспублікі Беларусь

Класіфікацыя бібліяграфічных дапаможнікаў сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі ў адпаведнасці са структурай сацыяльнай сферы і сацыяльна-гуманітарных навук, з улікам відавога складу адлюстраваных дакументаў, іх крыніцазнаўчага значэння, па шырыні зместу і іншых прыметах.

У адпаведнасці са структурай сацыяльнай сферы і сацыяльна-гуманітарных навук выдзяляюць бібліяграфічныя паказальнікі па: сацыялогіі; статыстыцы; дэмаграфіі; па гісторыі, гістарычных навуках, крыніцазнаўстве, дапаможных (спецыяльных) гістарычных дысцыплінах; эканоміцы, эканамічных навуках; палітыцы, палітычных навуках; праве, правазнаўстве;. ваеннай справе, ваеннай навуцы; культуры, культуралогіі; навуцы, навуказнаўстве; навукова-інфармацыйнай дзейнасці, інфарматыцы; адукацыі, педагагічных навуках; сродках масавай інфармацыі, журналістыцы; кніжнай справе, кнігазнаўстве; бібліятэчнай справе, бібліятэказнаўстве; бібліяграфіі, бібліяграфазнаўстве; музейнай справе,музеязнаўстве; архіўнай справе, архівазнаўстве; мовазнаўстве; рэлігіі, рэлігіязнаўстве; філасофіі; псіхалогіі.

Па шырыні зместу бібліяграфічныя паказальнікі дзеляцца на:

1) агульнагаліновыя:
- па сацыяльна-гуманітарных навуках у цэлым,
- па асобным комплексе сацыяльна-гуманітарных навук (гістарычных, эканамічных, юрыдычных, педагагічных);

2) галіновыя;

3) тэматычныя:
- па праблеме пэўнай навукі,
- па міжгаліновай праблеме

4) персанальныя, поліперсанальныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5) рэгіёназнаўчыя:

- прысвечаныя пэўнаму рэгіёну свету,
- краіназнаўчыя,
- краязнаўчыя.

Класіфікацыя дапаможнікаў, якія адлюстроўваюць асобныя групы дакументаў крыніцазнаўчага значэння для пэўных галін сацыяльнай сферы і сацыяльна-гуманітарных навук:

– паказальнікі выданняў афіцыйных дакументаў і паказальнікі да гэтых выданняў (прававых актаў; афіцыйных дакументаў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў);

– паказальнікі нарматыўных вытворча-практычных выданняў у розных галінах сацыяльнай сферы (напрыклад, адукацыйных стандартаў, стандартаў сістэмы СИБИД);

– паказальнікі статыстычных публікацый;

– паказальнікі твораў дзяржаўных, палітычных, гаспадарчых, грамадскіх, ваенных, рэлігійных дзеячаў, юрыстаў, падагогаў, журналістаў, вучоных-гуманітарыяў, дзеячаў культуры, выдавецкай, бібліятэчнай, архіўнай, музейнай справы і г. д. (у т.л. прыжыццёвых і рэдкіх выданняў, мемуарнай, эпісталярнай спадчыны, дзённікаў; паказальнікі да выданняў);

– паказальнікі выданняў кананічных рэлігійных тэкстаў (напрыклад, кніг Свяшчэннага Пісання), паказальнікі да гэтых выданняў, паказальнікі абразоў;

– паказальнікі сацыяльна-гуманітарных перыядычных выданняў і выданняў, якія прадаўжаюцца, паказальнікі іх зместу;

– паказальнікі картаграфічных дакументаў, атласаў (сацыяльна-эканамічных, палітычных, гістарычных, ваенных, этнаграфічных, лінгвістычных);

– паказальнікі лістовак, плакатаў, паштовак, фотадакументаў;

– паказальнікі даведачных выданняў, слоўнікаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– паказальнікі доктарскіх, кандыдацкіх і магістэрскіх дысертацый, аўтарэфератаў дысертацый;

– паказальнікі выданняў навукова-даследчых інстытутаў, установаў вышэйшай адукацыі, бібліятэк, іншых арганізацый і ўстаноў;

– паказальнікі вучэбных і вучэбна-метадычных выданняў, наглядных дапаможнікаў;

– каталогі, тэматычныя планы выдавецтваў, праспекты выданняў установаў і арганізацый;

– каталогі спецыялізаваных бібліятэк сацыяльна-гуманітарнага профілю (педагагічных, рэлігійных, бібліятэк выдавецтваў, прыватных бібліятэк вучоных-гуманітарыяў, грамадскіх дзеячаў і г.д.);

– паказальнікі калекцый рэдкіх кніг у фондах бібліятэк (рукапісаў і кніжных збораў гістарычных асоб, вучоных-гуманітарыяў і інш.);

– паказальнікі дакументаў з архіваў, музейных збораў;

паказальнікі некралогаў;

– паказальнікі аўдыёвізуальных дакументаў, грампласцінак, відэазапісаў, слайдаў:

– паказальнікі дакументаў на машыначытальных носьбітах (кампакт-дыскаў, баз дадзеных і інш.);

– паказальнікі бібліяграфічнай прадукцыі (бібліяграфічных выданняў; рэфератыўных, аглядных выданняў; неапублікаванай бібліягр. прадукцыі; даведнікі па каталогах і картатэках, бібліяграфічных базах дадзеных, бібліяграфічных рэсурсах інтэрнэт).

Рэтраспектыўныя бібліяграфічныя выданні Рэспублікі Беларусь па сацыяльных і гуманітарных навуках. Галіновыя і тэматычныя рэтраспектыўныя бібліяграфічныя дапаможнікі па сацыяльных і гуманітарных навуках. Беларусазнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі аб развіцці галін сацыяльнай сферы і сацыяльна-гуманітарных навук. Паказальнікі асобных відаў сацыяльна-гуманітарных дакументаў крыніцазнаўчага значэння. Бібліяграфічныя выданні, якія адлюстроўваюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навуковыя працы супрацоўнікаў і выданні асобных устаноў сацыяльна-гуманітарнай сферы (навукова-даследчых інстытутаў, вышэйшых навучальных устаноў, бібліятэк і інш). Персанальныя бібліяграфічныя дапаможнікі аб дзеячах сацыяльна-гуманітарнай сферы. Крыніцы інфармацыі аб сацыяльна-гуманітарнай бібліяграфічнай прадукцыі.

Крыніцы бягучай бібліяграфічнай інфармацыі аб дакументах сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі, звязаных з Беларуссю па змесце, аўтарской прымеце, выдадзеных на тэрыторыі Беларусі, аб новых паступленнях сацыяльна-гуманітарных дакументаў у фонды бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў.

Бібліяграфічныя базы даных па сацыяльных і гуманітарных навуках бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў Рэспублікі Беларусь.

Стан і тэндэнцыі развіцця змястоўнага і відавога складу бібліяграфічных рэсурсаў асобных сфер сацыяльнай дзейнасці і сацыяльна-гуманітарных навук у Рэспубліцы Беларусь: гісторыі і дапаможных гістарычных дысцыплін, права і правазнаўства, эканомікі і эканамічных навук, адукацыі і педагагічных навук, навуказнаўства і інш.

Літаратура:


1. Захарчук, Т.В. Інфармацыйныя рэсурсы для бібліятэк: вучэбна-практ. дапаможнік / Т. В. Захарчук. – СПб: Прафесія, 2011. – 126 с.
2. Галіновыя інфармацыйныя рэсурсы: падручнік / рэд.: Р.С. Гілярэўскі, Т.В. Захарчук. – СПб.: Прафесія, 2015. – 415 с.


## Лекцыя 10.
## Тэндэнцыі развіцця сусветных бібліяграфічных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы

Тэндэнцыі развіцця бібліяграфічных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ў Расійскай Федэрацыі, іх дыферэнцыяцыя па сферах сацыяльнай дзейнасці і галінах навук, іншых прыметах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Назапашаны вялікія масівы бібліяграфічнай інфармацыі аб навуковай і даведачнай літаратуры па філасофіі, сацыялогіі, паліталогіі такімі ўстановамі як РКП, ІНІГН РАН.

ІНІГН РАН вядзе бібляграфічныя БД “БД по государству и праву. Правоведение. Политология”, “БД по философии и социологии”, якія ўтрымліваюць расійскую і замежную літаратуру (кнігі, аўтарэфераты дысертацый, артыкулы з часопісаў, вучэбную літаратуру і інш.).

Дзяржаўныя бібліяграфічныя паказальнікі афіцыйных дакументаў РФ. Паказальнікі асобных відаў дакументных гістарычных крыніц. Паказальнікі электронных рэсурсаў. Паказальнікі бібліяграфічнай прадукцыі сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі (дзейнасць Парламенцкай бібліятэкі РФ).

Галіновыя бягучыя бібліяграфічныя выданні па сацыяльных і гуманітарных навуках (ІНІГН: “Філасофія і сацыялогія”, “Новая литература по социальным и гуманитарным наукам. Правоведение. Политология”, “Новая литература по социальным и гуманитарным наукам. Экономика”. *Парламенцкая бібліяэка РФ*: “Текущий библиографический указатель публикаций федеральных конституционных законов в “Собрании законодательства Российской Федерации”. УІНІТІ РАН: РЖ “Экономика промышленности”, “Организация управления” и інш.)

Базы даных сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў РФ федэральнага і рэгіянальнага ўзроўню (БД ІНІГН, УІНІТІ, “Научная Сибирика” ДПНТБ СА РАН і інш.).

Тэндэнцыі развіцця бібліяграфічных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ў краінах СНД і іншых замежных краінах. Асаблівасці змястоўнага і відавога складу бібліяграфічнай прадукцыі па рознах галінах сацыяльна-гуманітарных навук.

За мяжой новая літаратура па розных галінах сацыяльна-гуманітарнай сферы адлюстроўваецца ў спецыялізаваных міжнародных базах дадзеных і паказальніах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інавацыйныя віды сусветных бібліяграфічных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы.

Забеспячэнне доступу карыстальнікаў Рэспублікі Беларусь да сусветных бібліяграфічных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі ў бібліятэках Рэспублікі Беларусь.

Літаратура:

1. Захарчук, Т.В. Інфармацыйныя рэсурсы для бібліятэк: вучэбна-практ. дапаможнік / Т. В. Захарчук. – СПб: Прафесія, 2011. – 126 с.

2. Галіновыя інфармацыйныя рэсурсы: падручнік / рэд.: Р.С. Гілярэўскі, Т.В. Захарчук. – СПб.: Прафесія, 2015. – 415с.

## 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### 3.1. Метадычныя рэкамендацыі да выканання семінарскіх, практычных і лабараторных заняткаў

Мэта дадзеных метадычных рэкамендацый – дапамога студэнтам у замацаванні тэарэтычных ведаў аб сутнасці, структуры, метадычных і тэхналагічных асаблівасцях разнастайных відаў інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы, набыццё ўменняў і навыкаў іх аналізу і сінтэзу, кампетеэнтнасці стварэння разлічных формаў бібліяграфічнай характарыстыкі, відавой дыферэнцыяцыі, а таксама набыццё навыкаў правядзення разнастайных відаў галіновага пошуку і, ўрэшце рэшт, дасягненне кампетэнтнаснага ўзроўню інфармацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці ў сацыяльна-гуманітарнай сферы.

Семінарскія заняткі маюць на мэце паглыбленне і пашырэнне ведаў па найбольш актуальных і запатрабаваных у практычнай дзейнасці бібліятэк тэмах, аналіз і сінтэз, крытычнае асмысленне і выпрацоўку асабістага меркавання па найбольш істотных пытаннях вывучаемай тэмы (тэматыка семінараў прадугледжвае індывідуальны падыход з уліам падрыхтаванасці і перавагі студэнтаў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Практычныя і лабараторныя заняткі звязаны з выпрацоўкай уменняў і навыкаў у галіновай бібліяграфічнай дзейнасці: засваенне методыкі і тэхналогіі стварэння разнастайных відаў інфармацыйных рэсурсаў з улікам розных крытэрыяў, пакладзеных у аснову іх зместу і стрктуры. Для кожнай тэмы прадугледжаны від заняткаў, мэта работы, заданнне і методыка яго выканання, спіс крыніц, якія дапамагаюць ажыццявіць практычныя дзеянні.

Метадычныя рэкамендацыі прызначаны для правядзення заняткаў са студэнтамі ўсіх напрамкаў спецыялізацый дзённай і завочнай формы навучання.

Метадычныя рэкамендацыі ўтрымліваюць тэматыку заняткаў, метадычныя парады да іх выканання, пытнанні і крыніцы выяўлення інфармацыі да семінарскіх заняткаў, метадычня рэкамендацыі да практычных і лабараторных заняткаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лабараторнаяработа № 1**. Выданні прававых актаў як крыніцы бібліяграфічнага пошуку**

***Мэта:*** замацаваць уяўленні аб відах прававых актаў і відах іх выданняў; азнаёміцца са складам навукова-даведачнага апарату монавыданняў і зборнікаў прававых актаў, пошукавымі магчымасцямі яго асобных элементаў.

***Змест і методыка выканання.*** На лабараторных занятках кожны студэнт аналізуе монавыданне і зборнікі нарматыўна-прававых актаў Рэспублікі Беларусь. У працэсе аналізу студэнт вызначае від выдання, якія віды прававых актаў надрукаваны ў выданні, з якіх элементаў складаецца навукова-даведачны апарат выдання і якія віды пошуку прававых актаў можна ажыццявіць з дапамогай яго асобных элементаў (дадатак 1).

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Якія віды прававых актаў прымаюцца (выдаюцца) Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь? Нацыянальным сходам (Саветам Рэспублікі і Палатай Прадстаўнікоў)? Саветам Міністраў? Прэм’ер-міністрам? Органамі судовай улады? Міністэрствамі і ведамствамі Рэспублікі Беларусь?
2. Якія віды прававых актаў часцей за ўсё друкуюцца ў выглядзе монавыданняў?
3. Назавіце віды зборнікаў прававых актаў Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Якія элементы навукова-даведачнага апарату часцей за ўсё змяшчаюцца ў монавыданнях прававых актаў? У зборніках розных відаў?
5. Якія разнавіднасці фактаграфічнага пошуку можна здзейсніць па выданнях прававых актаў?
6. Назавіце віды бібліяграфічнага пошуку прававых актаў.
7. Якія разнавіднасці ўдакладняючага бібліяграфічнага пошуку вылучаюцца ў практыцы даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў прававой інфармацыі? Чым яны адрозніваюцца паміж сабою?
8. Якія элементы навукова-даведачнага апарату выданняў прававых актаў мэтазгодна выкарыстоўваць для:
   - пошуку часткі тэксту прававога акта?
   - пошуку звестак аб даце і органе прыняцця дакумента?
   - тэматычнага бібліяграфічнага пошуку прававых актаў?
   - удакладнення бібліяграфічных звестак аб пэўным дакуменце?
   - удакладнення бібліяграфічных звестак аб крыніцы вытрымкі з тэксту дакумента?
9. Па якіх крыніцах можна
   - удакладняць бібліяграфічныя звесткі аб выданнях прававых актаў?
   - ажыццявіць іх адрасна-бібліяграфічны пошук?

**Пералік выданняў для аналізу:**

1. Монавыданне Канстытуцыі Рэспублікі або кодэкса Рэспублікі Беларусь (з прадметным паказальнікам).
2. Зборнікі:

   А) універсальны зборнік дзеючага заканадаўства;

   Б) зборнік дзеючых нарматыўных прававых актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

   В) тэматычны зборнік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Дадатак 1. Віды пошуку прававых актаў (дакументаў)

| Від пошуку | Фактаграфічны | | Бібліяграфічны | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Пошук часткі тэксту дакумента (прававога акта) | Устанаўленне кім, калі прыняты (зменены, адменены) дакумент (прававы акт) | Тэматычны | Удакладняючы | | | Адрасны |
| | | | | Удакладненне бібліягр. звестак **аб дакуменце** (прававым акце) | Удакладненне бібліягр. звестак **аб крыніцы вытрымкі з тэксту дакумента** (прававога акта) | Удакладненне бібліягр. звестак **аб выданні дакументаў** ***(монавыданні, бюлетэні, зборніку, электронным выд.-CD)*** | |
| Форма прадстаўлення адказу | Частка тэксту дакумента (прававога акта)<br>+<br>Бібліягр. спасылка на крыніцу вытрымкі (аналітычнае бібліяграфічнае апісанне дакумента (прававога акта) з указаннем старонкі(ак) фрагменту тэкста). | Назва органа дзярж. улады і кіравання, які прыняў дакумент.Дата прыняцця (змены, адмены) дакумента (прававога акта). | Тэматычны бібліягр. спіс дакументаў, адабраных у адпаведнасці з запытам, апісаных адпаведна дзеючаму стандарту на бібліягр. апісанне, згрупаваных адпаведна іерархіі прававых актаў. | *Аналітычнае* бібліягр. апісанне дакумента (прававога акта) у газеце, нарматыўным бюлетэні, часопісе, зборніку, электронным выданні (CD), БД, інтэрнэт-рэсурсе..<br>*Манаграфічнае* бібліяграфічнае апісанне дакумента (прававога акта). | *Аналітычнае* бібліяграфічнае апісанне дакумента (прававога акта) з указаннем старонкі(ак) вядомага фрагментутэкста . | Бібліяграфічнае апісанне монавыдання дакумента (прававога акта) ці аднатомнага зб. дакументаў (манаграфічнае апісанне).<br>Шматузроўневае бібліяграфічнае апісанне нарматыўнага бюлетэня ці шматтомнага зборніка, электроннага выдання(CD), якое складаецца з некалькіх частак. | Бібліягр. апісанне монавыдання, зб. ці бюлетэня, электроннага выдання (CD) з указаннем месца яго захавання (сіглы бібліятэкі, скарочанага абазначэння падраздзялення бібліятэкі (філіяла, аддзела), шыфра ці інвентарнага нумара выдання, пад якім яно захоўваецца ў фондзе). |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Лабараторная работа № 2. **Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь**

***Мэта:*** знаёмства з пошукавымі магчымасцямі галоўнага дзяржаўнага рэсурса прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь аддаленага доступу, фарміраванне першасных навыкаў пошуку нарматыўна-прававой інфармацыі з выкарыстаннем электронных рэсурсаў прававой інфармацыі ў рэжыме online, замацаванне навыкаў аналітычнага бібліяграфічнага апісання прававых актаў на прыкладзе электронных рэсурсаў.

***Методыка выканання:*** Заняткі праводзяцца ў камп'ютарных класахз выкарыстаннем Нацыянальнага прававога Інтэрнэт-партала Рэспублікі Беларусь (http://pravo.by/).

Студэнты знаёмяцца з інтэрфейсам партала, яго структурай (раздзел "Карта портала"), раздзеламі, якія, ўтрымліваюць нарматыўна-прававую інфармацыю:

– «Официальное опубликование»,
– «Проекты законов»,
– «Помнікі гісторыі права Беларусі».

Кожны студэнт павінен апісаць па адным дакуменце з кожнага з пералічаных радзелаў партала (усяго тры).

Вынікі пошуку прававых актаў на Нацыянальным прававым Інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь афармляюцца улікам "ГОСТ 7.82-2001. Библиографическая запись. Библиографическое описание электронных ресурсов. Общие требования и правила составления".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратура:

1.ГОСТ 7.82-2001 Библиографическая запись. библиографическое описание электронных ресурсов. Общие требования и правила составления [Электронный ресурс] : межгосударственный стандарт /Межгосударственный совет по стандартизации, метрологии и сертификации. – Минск, [Б. г.]. – (Система стандартов по информации,

библиотечному и издательскому делу). – Режим доступа : http://www.spsl.nsc.ru/win/nelbib/help/gost7.82-2001.htm. – Дата доступа : 01.09.2018.

**Пример**

**библиографического описания государственного информационно-правового ресурса Республики Беларусь удаленного доступа***

1. О принятии в собственность Республики Беларусь имущества [Электронный ресурс] : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 18 февр. 2014 г., № 137 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа: http: //pravo.by/main.aspx?guid=3871&p0=C21400137&p1=1&p5=0. – Дата доступа : 26.06.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа : http://www.pravo.by/main.aspx?guid=12631. – Дата доступа : 26.06.2017.

Лабараторная работа № 3. **Інфармацыйна-пошукавая сістэма "Эталон"**

***Мэта:*** фарміраванне першасных навыкаў пошуку нарматыўна-прававой інфармацыі з выкарыстаннем поўнатэкставых баз даных прававой інфармацыі, замацаванне навыкаў аналітычнага бібліяграфічнага апісання прававых актаў на прыкладзе лакальных электронных рэсурсаў.

***Методыка выканання:***Заняткі праводзяцца ў камп'ютарных класах ў рэжыме лакальнага доступу да ІПС "Эталон". Студэнты знаёмяцца з інтэрфейсам ІПС, асаблівасцямя фарміравання запытаў пры пошуку інфармацыі ў БД:

– «Законодательство Республики Беларусь»,
– «Решения органов местного управления и самоуправления»,
– «Международные договоры».

Кожный студэнт выконвае па аднаму запыту па кожнай з названых баз даных.

У якасці пошукавых запытаў выкарыстоўваюцца заданні №№ 1а, 1б–г, 1е з прапануемых ніжэй варыянтаў (гл. с.   ).

Вынікі пошуку прававых актаў у базах дазеных ІПС "Эталон" афармляюцца ў выглядзе табліцы (гл. дадатак, с.   ).

Бібліяграфічнае апісанне ажыццяўляецца з улікам ГОСТ "Библиографическое описание электронных ресурсов» і прыведзеных у дадатку узораў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Літаратура:*

1. ГОСТ 7.82-2001 Библиографическая запись. Библиографическое описание электронных ресурсов. Общие требования и правила составления [Электронный ресурс] : межгосударственный стандарт / Межгосударственный совет по стандартизации, метрологии и сертификации. – Минск, [Б. г.]. – (Система стандартов по информации, библиотечному и издательскому делу). – Режим доступа :

http://www.spsl.nsc.ru/win/nelbib/help/gost7.82-2001.htm. – Дата доступа : 01.09.2014.

2. Примеры библиографического описания государственных информационно-правовых ресурсов и печатных изданий Национального центра правовой информации Республики Беларусь // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа : http://www.pravo.by/main.aspx?guid=12631. – Дата доступа : 26.06.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Примеры библиографического описания государственных информационно-правовых ресурсов*

### *Государственные информационно-правовые ресурсы локального доступа*

1. Кодекс Республики Беларусь о земле [Электронный ресурс] : 23 июля 2008 г., № 425-З : принят Палатой представителей 17 июня 2008 г. : одобр. Советом Респ. 28 июня 2008 г. : в ред. Закона Респ. Беларусь от 4 янв. 2014 г. // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2014.

2. О признании утратившими силу некоторых решений Минского областного исполнительного комитета [Электронный ресурс] : решение Мин. облисполкома, 11 нояб. 2011 г., № 1571 // ЭТАЛОН. Решения органов местного управления и самоуправления / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2014.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Гл.: Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа : http://www.pravo.by/main.aspx?guid=12631. – Дата доступа : 26.06.2017.

## Лабараторная работа № 4. **Інфармацыйныя рэсурсы Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь**

*(праводзіцца ў форме экскурсіі)*

***Мэта*** – фарміраванне ўяўлення аб місіі і задачах Прэзідэнцкай бібліятэкі бібліятэкіРэспублікі Беларусь як галіновага бібліятэчна-інфармацыйнага цэнтра па праблемах дзяржаўнага кіравання і парламентарызма, права, эканомікі і грамадскіх навук; відавым і тэматычным складзе інфармацыйных рэсурсаў; сучасных інфармацыйных прадуктах і паслугах бібліятэкі; тэхналогіі іх стварэння і давядзення да карыстальнікаў; інавацыйных накірунках дзейнасці бібліятэкі з выкарыстаннем сучасных інфармацыйных тэхналогій

Напярэдадні экскурсіі студэнты павінны азнаёміцца з сайтам бібліятэкі : ***http://preslib.org.by***.

Пры наведванні бібліятэкі студэнты знаёмяцца з асаблівасцямі дзейнасці такіх структурных падраздзяленняў бібліятэкі, як:

- аддзел фарміравання электроннай бібліятэкі,
- аддзел інфармацыйных рэсурсаў (у т.л. інфармацыйна-даведачнай службы і сектара замежных выданняў);
- інфармацыйна-аналітычны аддзел;
- аддзел бібліятэчна-інфармацыйных тэхналогій і
- аддзел старадрукаваных і рэдкіх выданняў,
- аддзел абслугоўвання карыстальнікаў.

Па выніках правядзення экскурсіі кожны студэнт рыхтуе рэферат, у якім адлюстроўвае асноўныя напрамкі дзейнасці бібліятэкі як галіновага бібліятэчна-інфармацыйнага цэнтра па праблемах дзяржаўнага кіравання і парламентарызма, права, эканомікі і грамадскіх навук.

У рэферат могуць уключацца фотаздымкі, зробленыя студэнтамі ў час экскурсіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У заключэнні рэферата фармулююцца прапановы па ўдасканаленні дзейнасці бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Лабараторная работа № 5. **Цэнтры фарміравання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ў краінах СНД і бліжняга замежжа**

***Мэта***: фарміраванне ўяўленняў аб асноўных тыпах бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў, якія ствараюць інфармацыйныя рэсурсы сацыяльна-гуманітарнай сферы у замежных краінах (на прыкладзе краін СНД і бліжняга замежжа), відавым і змястоўным складзе інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі, перспектыўных накірунках іх развіцця.

***Змест і методыка выканання***: Кожнытудэнт аналізуе сайт адной з бібліятэк ці інфармацыйнага цэнтра (спіс дадаецца).

Пасля азнаямлення з картай сайта бібліятэкі/цэнтра студэнты выбарачна аналізуюць раздзелы сайта, якія змяшчаюць інфармацыю аб інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсах сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі.

У рэфератыўнай форме фіксуюцца звесткі аб дзейнасці бібліятэкі па фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў уласнай вытворчасці, а таксама інфармацыйных рэсурсах іншых цэнтраў, да якіх забяспечваецца доступ у бібліятэцы/цэнтры.

У працэсе аналізу сайтаў прыярытэтная ўвага звяртаецца на такія раздзелы сайта, як:

- Гісторыя бібліятэкі/цэнтра
- Рэсурсы (бібліятэчны фонд), у тым ліку:
  - Электронныя бібліятэкі
  - Калекцыі дакументаў (тэматычныя, асобных відаў дакументаў)
- Каталогі
- Бібліяграфічныя базы дадзеных
- Бібліяграфічныя выданні
- Удзел у карпаратыўных бібліяграфічных праектах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- Віртуальная даведачная служба
- Праекты
- Тэзаўрусы і інш.

***Прыкладны пералік сайтаў бібліятэк/цэнтраў для аналізу***:

| | |
|---|---|
| Российская государственная библиотека (РГБ) | http://www.rsl.ru/ |
| Российская национальная библиотека (РНБ) | http://www.nlr.ru/ |
| Всероссийская государственная библиотека иностранной литературы им. М.И. Рудомино (ВГБИЛ) | http://www.libfl.ru/ |
| Президентская библиотека имени Б.Н.Ельцина | http://www.prlib.ru/ |
| Парламентская библиотека Российской Федерации | http://parlib.duma.gov.ru/ |
| Президентская библиотека Управления делами президента Азербайджанской Республики | http://www.preslib.az/ru/ |
| Отдел библиотечно-информационного обеспечения информационного управления Аппарата Верховной Рады Украины | http://lib.rada.gov.ua/ |
| Институт научной информации по общественным наукамРоссийской академии наук | http://www.inion.ru/ |
| Государственнаяпубличнаяисторическая библиотека (ГПИБ) России | shpl.ru |
| Центр социально-политической истории ГПИБ , | http://www.shpl.ru/readers/centr_sotcialino_politicheskoy_istorii/ |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| Научная педагогическая библиотека имени К. Д. Ушинского Российской академии образования (РАО) | http://www.gnpbu.ru/ |
| Государственная научно-педагогическая библиотека Украины им. В.О.Сухомлинского Национальной Академии педагогических наук Украины | http://www.dnpb.gov.ua/ |
| Центральная научная библиотека Министерства образования и науки Республики Казахстан | http://www.library.kz/ru/ |
| Российская государственная библиотека для молодёжи | http://www.rgub.ru/ |
| Библиотека Дома русского зарубежьяимени Александра Солженицына | http://www.bfrz.ru/ |
| Библиотека им. Мигеля Делибеса Института Сервантеса в Москве | http://moscu.cervantes.es/ru/biblioteka_ispanskiy/biblioteka_ispanskiy.htm |

Пры выбары бібліятэк студэнты дадаткова могуць карыстацца "Каталогам бібліятэчных сайтаў" раздзела "Мир библиотек (библионет)" інфармацыйна-даведачнага партала library.ru[1]або раздзелам "Библиотеки зарубежных стран" базы дадзеных «Библиотеки Республики Беларусь и зарубежных стран» на партале Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь[2].

Вынікі аналізу афармляюцца ў выглядзе рэферату (аб'ёмам 6-7 старонак). Рэферат можа быць выкарыстаны ў працэсе падрыхтоўкі да вучэбнай навукова-практычнай канферэнцыі "Інфармацыйныя рэсурсы сацыяльна-гуманітарнай сферы: традыцыі і навацыі".

[1]http://www.library.ru/3/biblionet/

[2]http://interlib.nlb.by/bb/bm/bm.php?menu_id=2

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лабараторная работа № 6.**Персанальныя старонкі вучоных-грамадазнаўцаў і -гуманітарыяў як інфармацыйны рэсурс**

***Мэта***: засвоіць асаблівасці структуры і зместу персанальных старонак вучоных-грамадазнаўцаў і -гуманітарыяў як аднаго з сучасных відаў інтэрнэт-рэсурсаў у сацыяльна-гуманітарнай сферы, выпрацаваць навыкі параўнальнага аналізу дадзенага віду рэсурсаў на прыкладзе персанальных старонак супрацоўнікаў НДІ і устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь і РФ.

***Змест і методыка выканання***: Кожны студэнт на лабараторных занятках выбірае з прапанаванага пераліку сайтаў навукова-даследчых устаноў і устаноў вышэйшай адукацыі дзве персанальныя старонкі (адну - супрацоўніка НДІ і/ці установы вышэйшай адукацыі Рэсрублікі Беларусь і другую – РФ) (дадатак 1).

Вынікі параўнальнага аналізу персанальных старонак фіксуюцца ў пісьмовай форме па прапанаванай схеме (дадатак 2).

На заключным этапе студэнт афармляе высновы, ў якіх адзначае асаблівасці прадстаўлення фактаграфічнай і бібліяграфічнай інфармацыі на персанальнаых старонках, магчымасці поўнатэкставага доступу да публікацый вучонага, інавацыйныя асаблівасці старонкі (наяўнасць звестак аб публікацыйнай актыўнасці аўтара ў навукаметрычных БД, магчымасці ўстанаўлення персанальных кантактаў у электронным асяродку і інш), а таксама фармулюе прапановы па ўдасканаленні персанальных старонак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Дадатак 2. Схема параўнальнага аналізу структуры персанальных старонак вучонага (выкладчыка)-грамадазнацы – гуманітарыя

| Структурныя элементы персанальнай старонкі вучонага (выкладчыка) | Назва УВА(НДУ)-**1**, назва кафедры, прозвішча, імя, імя па бацьку вучонага-выкладчыка, персанальная старонка якога з'яўляецца аб'ектам аналізу | Назва УВА(НДУ)-**2**, назва кафедры, прозвішча, імя, імя па бацьку вучонага-выкладчыка, персанальная старонка якога з'яўляецца аб'ектам аналізу |
|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 |
| ***Прозвішча, імя, імя па бацьку***<br>***Пасада***<br>***Вучоная ступень (напрыклад: канд … навук)***<br>***Вучонае званне (напрыклад: дацэнт)***<br>***Адукацыя***<br>***Тэма магістэрскай (кандыдацкай, (доктарскай) дысертацыі, год абароны***<br>***Сфера навуковых інтарэсаў***<br>***Выкладаемыя вучэбныя дысцыпліны***<br>***Узнагароды***<br>***Кантакты:***<br>*тэл.*<br>*факс*<br>*e-mail*<br>*[інш.]*<br><br>***Статыстычныя звесткі аб колькасці публікацый***<br><br>***Іншыя фактаграфічныя звесткі****(выявіць і сфармуляваць самастойна)*:<br>– … ;<br>– … .<br><br>***Публікацыйная актыўнасць (цытуемасць)***<br><br><br><br>***Бібліяграфічны спіс публікацыі*** (спосаб групоўкі публікацый – відавая, храналігічная; прыклады рубрык)<br>Манаграфіі, кнігі<br>Артыкулы ў рэцэнзуемых часопісах<br>Артыкулы ў зборніках навуковых прац<br>Матэрыялы навуковых канферэнцый<br>[інш.]<br><br>Асаблівасці прадстаўлення публікацый у | Наяўнасць элементаў персанальнай старонкі адзначаецца знакам +<br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br>Назва навукаметрычнай БД[3] | ) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[3]Напрыклад:GoogleScholarCitations, ИСТИНА (Интеллектуальная Система Тематического Исследования НАукометрических данных).

| | | |
|---|---|---|
| ***поўнатэкставым*** фармаце:<br>- у асобнай рубрыцы<br>- у межах відавых ці храналагічных рубрык<br>- % поўнатэкставых публікацый на персанальнай старонцы<br><br>Гіперспалылка на кафедру<br><br>***Іншыя элементы персанальнай старонкі*** *(выявіць і сфармуляваць самастойна)*:<br>– … ;<br>– … . | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Лабараторная работа № 7. **Аналіз метадычных асаблівасцей паказальнікаў асобных відаў сацыяльна-гуманітарных дакументаў**

***Мэта:*** звярнуць увагу на прыёмы спецыялізаванага (у асобных дапаможніках) бібліяграфавання такіх груп сацыяльна-гуманітарных дакументаў, якія маюць для адпаведных галін сацыяльнай практыкі і сацыяльна-гуманітарных навук найбольшае крыніцазнаўчае значэнне; выпрацаваць навык прыняцця прафесійных рашэнняў па ўдасканаленні бібліяграфічнай прадукцыі.

***Змест і методыка выканання: к***ожны студэнт выбірае для аналізу па адным выданні з ніжэй прапанаваных відаў бібліяграфічных дапаможнікаў (дадатак 2).

Аналізуючы паказальнік, неабходна ўважліва вывучыць змест, прадмову, асноўны тэкст і навукова-даведачны аппарат, выявіць анатацыі з найбольшым наборам звестак аб аб’екце бібліяграфавання. Вынікі аналізу афармляюцца па схеме (дадатак 1).

У працэсе аналізу пад кіраўніцтвам выкладчыка праводзіцца кароткае абмеркаванне метадычных асаблівасцей падрыхтоўкі паказальнікаў асобных відаў сацыяльна-гуманітарных дакументаў.

***Прыкладныя пытанні для абмеркавання:***

1. Дляякіхгалінсацыяльнайсферыі сацыяльна-гуманітарных навук неабходнападрыхтоўкатакіхдапаможнікаўусучасныхумовах? Для якіх катэгорый карыстальнікаў інфармацыі яны ўяўляюць цікавасць?
2. У якіх тыпах бібліятэк могуць быць створаны паказальніку пэўнага віду сацыяльна-гуманітарных дакументаў? (Дапаможнікі якога віду могуць быць створаны ў бібліятэцы, дзе працуюць студэнты завочнай формы навучання?)
3. У якіх формах для карыстальнікаў пэўнага тыпу бібліятэк мэтазгодна рэалізаваць бібліяграфічныя паказальнікі прававых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актаў, …вучэбных, перыядычных, …даведачных выданняў, …БД, …інтэрнэт-рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі?

4. Назавіце элементы анатацыі, характэрныя для прававых актаў і іх выданняў, даведачных выданняў, перыядычных і іншых выданняў сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі, якія прадстаўлены ў аналізеумых дапаможніках.
5. Якія метадычныя рашэнні, выяўленыя ў працэсе аналізу паказальніка, заслугоўваюць выкарыстання ў сучаснай бібліяграфічнай прадукцыі сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі?Вашы прапановы па ўдасканаленні методыкі падрыхтоўкі паказальнікаў асобных відаў сацыяльна-гуманітарных дакументаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Дадатак 1. **Схема аналіза бібліяграфічнага дапаможніка**

1. Бібліяграфічнае апісанне дапаможніка.
2. Характарыстыка крыніцазнаўчага значэння адлюстраванага ў дапаможніку віду дакументаў.
3. Мэтавае прызначэнне бібліяграфічнага дапаможніка. Катэгорыі карыстальнікаў, якім яно адрасавана.
4. Крыніцы выяўлення матэрыялу: першасныя, другасныя (бібліяграфічныя).
5. Асаблівасці бібліяграфічнага апісання:
   –віды бібліяграфічнага апісання (манаграфічнае, аналітычнае, шматузроўневае), якія выкарыстоўваюцца ў дапаможніку;
   –спецыфіка бібліяграфічнага апісання адлюстраванага ў дапаможніку віду дакументаў, абавязковыя і факультатыўныя элементы апісання (прывесці прыклады).
6. Асаблівасці анатацый:
   –віды анатацый (індывідуальныя, групавыя; агульныя, аналітычныя; рэкамендацыйныя, даведачныя), якія выкарыстоўваюцца ў дапаможніку;
   –структурныя элементы анатацый (прывесці прыклады) (гл. дадатак 3).
7. Асаблівасці адбору дакументаў у паказальнік па відавой, змястоўнай, моўнай, храналагічнай прыкметах, месцы выдання і інш.
8. Асаблівасці групоўкі бібліяграфічных запісаў у дапаможніку:
   –віды раздзелаў і рубрык, якія выкарыстоўваюцца для адлюстравання зместу дакументаў (галіновыя, тэматычныя, гісторыка-храналагічныя, персанальныя, рэгіянальныя, у т.л. прысвечаныя рэгіёнам свету, краіназнаўчыя, краязнаўчыя) (прывесці прыклады);
   –раздзелы і рубрыкі, якія выкарыстоўваюцца для адлюстравання відавога складу дакументаў (прывесці прыклады);
   –спосаб групоўкі бібліяграфічных запісаў ў апошніх дзяленнях рубрык (храналагічны, алфавітны);
   –іерархізаванасць схемы групоўкі матэрыялу (колькасць ступеняў у схеме групоўкі матэрыялу);
   –наяўнасць нумарацыі бібліяграфічных запісаў.
9. Асаблівасці навукова-дапаможнага апарату паказальніка:
   –наяўнасць/адсутнасць прадмовы, асноўныя структурныя элементы прадмовы, арыгінальныя элементы ў прадмове;
   –наяўнасць спасылак паміж блізкімі па змесце раздзеламі і рубрыкамі;
   –дапаможныя паказальнікі і метадычныя асаблівасці іх пабудовы (структура рубрык прадметнага, геаграфічнага, іменнога і інш. паказальнікаў) (прывесці прыклады);
   –наяўнасць дадаткаў:
   –спісаў выкарыстаных крыніц выяўлення матэрыялу;
   –спісаў выкарыстаных скарачэнняў (скарачэнні якіх аб’ектаў уключаны ў іх – прывесці прыклады).
10. Асаблівасці рэдакцыйна-выдавецкага афармлення бібліяграфічнага паказальніка:
   –удзел у рэцэнзаванні і рэдагаванні выдання спецыялістаў і арганізацый, устаноў адпаведнага профілю;
   –асаблівасці графічнага афармлення тэксту бібліяграфічнага паказальніка (выкарыстанне розных шрыфтаў, водступаў, умоўных абазначэнняў);
   –наяўнасць ілюстрацыйных матэрыялаў і іншых спосабаў мастацкага афармлення вокладкі, тытульнага аркуша і тэксту паказальніка;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

–спосаб друку.

11. Складальнік (або калектыў складальнікаў) дапаможніка. Іншыя ўдзельнікі.
12. Іншыя асаблівасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Дадатак 2. **Прыкладны пералік відаў бібліяграфічных дапаможнікаў, якія прапануюцца для аналізу.**

1. Паказальнік прававых актаў.
2. Паказальнік адукацыйных стандартаў.
3. Паказальнік картаграфічных выданняў.
4. Паказальнік дакументальных публікацый.
5. Паказальнік лістовак.
6. Паказальнік перыядычных сацыяльна-гуманітарных выданняў.
7. Паказальнік зместу сацыяльна-гуманитарнага перыядычнага выдання або выдання, якое прадаўжаецца.
8. Паказальнік даведачных сацыяльна-гуманітарных выданняў.
9. Паказальнік (агляд) слоўнікаў.
10. Паказальнік прац вучонага-грамадазнаўца (гуманітарыя).
11. Паказальнікілітаратурнай спадчыны дзяржаўнага, палітычнага або грамадскага дзеяча.
12. Паказальнік успамінаў.
13. Каталог кніг спецыялізаванага выдавецтва.
14. Паказальнік выданняў навукова-даследчайустановы.
15. Паказальнік прац супрацоўнікаў установы вышэйшай адукацыі.
16. Паказальнік дысертацый.
17. Паказальнік вучэбных выданняў.
18. Паказальнік выданняў бібліятэкі.
19. Паказальнік бібліяграфічных выданняў.
20. Паказальнік (каталог) БД.
21. Паказальнік (даведнік) інтэрнэт-рэсурсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Дадатак 3. **Узор афармлення вынікаў аналізу анатацыі**

Гуманитарный издательский центр ВЛАДОС: [кат. выпуска учеб.-метод. лит.] лето 2000 – весна 2001. –М.,2000. С.122.

*Від анатацыі:*
агульная
індывідуальная
*Структура анатацыі:*
Від выдання
Паўната прадстаўлення матэрыялу
Назва вучэбнай дысцыпліны
Адпаведнасць вучэбнага выдання адукацыйнаму стандарту і вучэбнай праграме
Наяўнасць дыдактычнага матэрыялу

Носова С.С. Экономика. Краткий курс: учебное пособие для студентов вузов вечерних и заочных форм обучения. – 288с. : ил. – пер.

В *учебнике* изложен *краткий курсдисциплины “Экономика”в соотвествии с федеральным стандартом и примерной программой*, утвержденной Министерством образования Российской Федерации. *Диаграммы и графики* позволяют студенту лучше понять необходимый материал.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЛАБАРАТОРНАЯ РАБОТА № 8**. Выкананне пісьмовай тэматычнай бібліяграфічнай даведкі сацыяльна-гуманітарнайтэматыкі з выкарыстаннем поўнатэкставых баз дадзеных (БД) і электронных бібліятэк у рэжыме online**

***Мэта:*** фарміраванне ўменняў вызначаць неабходнае кола крыніц тэматычнага бібліяграфічнага пошуку; акцэнтаваць увагу на неабходнасці ўключэння ў тэматычную бібліяграфічную даведку сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі дакументаў крыніцазнаўчага характару, абавязковасць выкарыстання ў працэсе пошуку галіновых і універсальных поўнатэкставых электронных рэсурсаў.

***Змест і методыка выканання.*** Тэматычная даведка выконваецца па тэме курсавой работы студэнта. У працэсе аналіза тэмы, студэнт павінен па тэрміналагічных слоўніках, даведачных ці іншых выданнях выявіць, якія ключавыя словыз фармулёўкі тэмы і глаў курсавой работы,азначэнні асноўных тэрмінаў,канкрэтызаваць рэгіянальныя і гісторыка-храналагічныя межы даследуемай з'явы (праблемы), аспекты яе вывучэння; вызначыць, якія спецыяльныя віды дакументаў неабходныя для раскрыцця тэмы (нарматыўна-прававыя акты, манаграфіі, навуковыя артыкулы, электронныя, у т. л. web-рэсурсы, неапублікаваныя дакументы і інш.); акрэсліць храналагічныя, моўныя і тэрытарыяльныя рамкі адбору дакументаў.

Пошук поўнатэкставых матэрыялаў праводзіцца з выкарыстаннем:

1) базы дадзеных «Библиотечное дело иинформационное обслуживание», доступ да якой забяспечваецца ў лакальнай аўтаматызаванай сетцы УА БДУКМ ў рамках праекта “Віртуальная чытальная зала” Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (адрас доступу: http://dlib.eastview.com/). Інфармацыя аб выкарыстанні лагічных аператараў [*], [?], [+], [прабел], [-] і іншых функцыях механізму пошуку змяшчаецца на старонцы "Советы" рускамоўнага інтэрфейса пошукавай сістэмы БД;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) навуковай электроннай бібліятэкі eLIBRARY.RU (https://elibrary.ru/*). Для забеспячэння доступу да поўных тэкстаў дакументаў з мэтай устанаўлення іх змястоўнай адпаведнасці запыту студэнты павінны зарэгістравацца, затым запоўніць пошукавую форму:







РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*ООО Научная электронная библиотека

Пошук можа быць абмежаваны храналагічна.




Пажадана абраць сартыроўку вынікаў пошуку па рэлевантнасці:




Бібліяграфічныя апісанні дакументаў , выяўленых па БД у адпаведнасці з тэмай, капіруюцца, аб'ядноўваюцца ў адзіны спіс, групуюцца ў алфавітным парадку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даведка афармляецца ў выглядзе спіса і павінна ўключаць не менш 50 бібліяграфічных запісаў. У выпадках, калі назва публікацыі недастаткова інфарматыўная, бібліяграфічнае апісанне суправаджаецца даведачнай анатацыяй.

У тэксце бібліяграфічных запісаў курсівам вылучаюцца ключавыя словы тэмы запыта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лабараторныяработа № 9. **Пошук інфармацыі ў бібліяграфічнай базе даных Расінфармкультуры “Библиотечное дело и библиография”**

***Мэта:***фарміраванне ўменняў выкарыстання ў працэсе тэматычнага бібліяграфічнага пошуку галіновых электронных бібліяграфічных рэсурсаў.

***Змест і методыка выканання.***Тэматычны бібліяграфічны пошук па тэме курсавой работы студэнтаправодзіцца ў бібліяграфічнай базе дадзеных “Библиотечное дело и библиография» Расінфармкультуры (http://infoculture.rsl.ru/):




Пошук ажыццяўляецца з выкарыстаннем слоўніка ключавых слоўі адпаведных рубрык галіновага рубрыкатара.

Пры пошуку па ключавых словах выкарыстоўваюцца лагічныя аператары: І/ИЛИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




У залежнасці ад тэмы вызначаюцца хранагалагічныя, моўныя, відавыя і іншыя параметры пошуку:

У тэматычным рубрыкатары для пошуку выбіраецца адпаведная рубрыка:




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вынікі пошуку афармляецца ў выглядзе анатаванага спіса, які павінен ўключаць не менш 50 бібліяграфічных запісаў(у бібліяграфічным запісе захоўваецца анатацыя дакумента з БД).

Бібліяграфічнае апісанне дакументаў, выяўленых па БД у адпаведнасці з тэмай, аналізуюцца,




пры адпаведнасці запыту – капіруюцца і групуюцца ў алфавітным парадкуў форме спіса.

У тэксце бібліяграфічных запісаў курсівам вылучаюцца ключавыя словы тэмы запыта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Класіфікацыя бібліяграфічных дапаможнікаў сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі

Практычная работа

**Мэта:** Звярнуць увагу студэнтаў на спецыфічныя для інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы дапаможнікі (накіраваныя на раскрыццё дакументаў у адпаведнасці са структурай сацыяльнай сферы і сацыяльна-гуманітарных навук, паказальнікі асобных груп дакументаў крыніцазнаўчага значэння, розныя віды дапаможнікаў па мэтавым прызначэнні і шырыні зместу).

**Змест і методыка выканання.** Заданні выконваюцца па варыянтах (нумар вырыянта адпавядае нумару студэнта ў спісе групы).Кожны студэнт у адпаведнасці з варыянтам адбірае для класіфікацыі чатыры бібліяграфічныя дапаможнікі. Тыпалагічны аналіз бібліяграфічных дапаможнікаў ажыццяўляецца на падставе вывучэння тытульных аркушаў, прадмоў, зместу. У працэсе аналізу выкарыстоўваюцца наглядныя дапаможнікі (дадаткі 1 і 2). Вынікі аналізу афармляюцца па схеме:

| Бібліяграфічнае апісанне дапаможніка | Від бібліяграфічнага дапаможніка | | | |
|---|---|---|---|---|
| | У адпаведнасці са структурай сацыяльнай сферы і сацыяльна-гуманітарных навук | З улікам крыніцазнаўчага складу адлюстраваных дакументаў | Па мэтавым прызначэнні | Па шырыні зместу |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пытанні для самаправеркі

1. Назавіце вядомыя вам філасофскія навукі, гістарычныя, эканамічныя, юрыдычныя, педагагічныя навукі.
2. Якія віды дакументаў з'яўляюцца дакументальнымі гістарычнымі крыніцамі? Крыніцамі права? Выконваюць ролю крыніц пазнання ў іншых галінах сацыяльна-гуманітарных ведаў?
3. У дапамогу якім відам дзейнасці могуць ствараццa бібліяграфічныя дапаможнікі сацыяльна-гуманітарнага зместу?
4. Якія віды бібліяграфічных дапаможнікаў сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі можна вылучыць па шырыні зместу?

### *Індывідуальныя заданні для студэнтаў*

Варыянт 1. Паказальнікі:
а) нарматыўна-прававых актаў;
б) па навуцы, навуказнаўстве;
в) персанальны;
г) у дапамогу эканамічнай дзейнасці.

Варыянт 2. Паказальнікі:
а) нарматыўна-вытворчых выданняў;
б) па археалогіі;
в) краіназнаўчы;
г) у дапамогу журналісцкай дзейнасці.

Варыянт 3. Паказальнікі:
а) даведачных выданняў;
б) па эканоміцы, эканамічных навуках;
в) тэматычны па міжгаліновай праблеме;
г) у дапамогу прафесійнай бібліяграфічнай дзейнасці.

Варыянт 4. Паказальнікі:
а) зместу перыядычнага выдання;
б) па рэлігіязнаўстве;
в) прысвечаны пэўнаму рэгіёну свету;
г) у дапамогу педагагічнай дзейнасці.

Варыянт 5. Паказальнікі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а) картаграфічных выданняў;
б) па паліталогіі;
в) галіновы,
г) у дапамогу самаадукацыі.

Варыянт 6.Паказальнікі:
а) успамінаў;
б) па бібліятэчнай справе, бібліятэказнаўстве ;
в) тэматычны па праблеме пэўнай навукі;
г) у дапамогу вучэбнай дзейнасці.

Варыянт 7. Паказальнікі:
а) бібліяграфічнай прадукцыі;
б) па гісторыі філасофіі;;
в) агульнагаліновы па комплексе сацыяльна-гуманітарных навук;
г) у дапамогу кнігагандлёвай дзейнасці.

Варыянт 8. Паказальнікі:
а) дысертацый;
б) па дзяржаве і праве, юрыдычных навуках;
в) агульнагаліновы па сацыяльна-гуманітарных навуках у цэлым;
г) у дапамогу навуковай дзейнасці

Варыянт 9. Паказальнікі:
а) лістовак;
б) па ваеннай справе;
в) поліперсанальны;
г) у дапамогу музейнай дзейнасці.

Варыянт 10. Паказальнікі:
а) перыядычных выданняў;
б) па адукацыі, педагагічных навуках;
в) краязнаўчы (аб горадзе);
г)у дапамогу праваахоўнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дадатак 1. **Класіфікацыя бібліяграфічных дапаможнікаў сацыяльна-гуманітарнай сферы**

| У адпаведнасці са структурай сацыяльнай сферы і сацыяльна-гуманітарных навук | Па мэтавым прызначэнні | Па шырыні зместу |
| --- | --- | --- |
| Бібліяграфічныя паказальнікі:<br>1) па сацыялогіі;<br>2) па статыстыцы;<br>3) па дэмаграфіі;<br>4) па гісторыі, гістарычных навуках, крыніца-знаўстве, дапаможных (спецыяльных) гістарычных дысцыплінах;<br>5) па эканоміцы, эканамічных навуках;<br>6) па палітыцы, палітычных навуках;<br>7) па праве, правазнаўстве;.<br>8) па ваеннай справе, ваеннай навуцы;<br>9) па культуры, культуралогіі;<br>10) па навуцы, навуказнаўстве;<br>11) па навукова-інфармацыйнай дзейнасці, ін-фарматыцы;<br>12) па адукацыі, педагагічных навуках;<br>14) па сродках масавай інфармацыі, журналіс-тыцы;<br>15) па кніжнай справе, кнігазнаўстве;<br>16) па бібліятэчнай справе, бібліятэказнаўстве;<br>17) па бібліяграфіі, бібліяграфазнаўстве;<br>18) па музейнай справе,музеязнаўстве;<br>19) па архіўнай справе, архівазнаўстве;<br>20) па моваэнаўстве;<br>21) па рэлігіі, рэлігіязнаўстве;<br>22) па філасофіі;<br>23) па псіхалогіі. | Бібліяграфічныя паказальнікі:<br>1) у дапамогу кіраўнічай дзейнасці:<br>– у дапамогу дзяржаўнаму кіраванню (праватворчай, праваахоўнай, правапрымяняльнай дзейнасці);<br>– у дапамогу кіраванню ў асобных галінах сацыяльнай дзейнасці;<br>2) у дапамогу навуковай дзейнасці (*навукова-дапаможныя*);<br>3) у дапамогу прафесійнай практычнай дзейнасці ў розных галінах сацыяльнай сферы (*прафесійна-вытворчыя*):<br>– у дапамогу эканамічнай дзейнасці,<br>– у дапамогу палітычнай дзейнасці,<br>– у дапамогу педагагічнай дзейнасці,<br>– у дапамогу журналісцкай дзейнасці,<br>– у дапамогу выдавецкай, кнігагандлёвай дзейнасці,<br>– у дапамогу бібліятэчнай, бібліяграфічнай, інфармацыйнай дзейнасці,<br>– у дапамогу музейнай, архіўнай дзейнасці.<br>4) у дапамогу вучэбнай дзейнасці (*вучэбна-дапаможныя*);<br>5) у дапамогу самаадукацыйнай дзейнасці (*рэкамендацыйныя*);<br>6) у дапамогу грамадскай дзейнасці. | Бібліяграфічныя паказальнікі:<br>1) агульнагаліновыя:<br>- па сацыяльна-гумані-тарных навуках у цэлым,<br>- па асобным комплексе сацыяльна-гуманітарных навук (гістарычных, эканамічных, юрыдычных, педагагічных);<br>2) галіновыя;<br>3) тэматычныя:<br>- па праблеме пэўнай навукі,<br>- па міжгаліновай праблеме<br>(паказальнікі да выданняў - прадметныя);<br>4) персанальныя, поліперсанальныя (паказальнікі да выданняў – personalia);<br>5) рэгіёназнаўчыя:<br>- прысвечаныя пэўнаму рэгіёну свету,<br>- краіназнаўчыя,<br>- краязнаўчыя<br>(паказальнікі да выданняў – геаграфічныя). |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак 2.* ***Класіфікацыя дапаможнікаў, якія адлюстроўваюць асобныя групы дакументаў крыніцазнаўчага значэння для пэўных галін сацыяльнай сферы і сацыяльна-гуманітарных навук***

1) Паказальнікі* выданняў афіцыйных дакументаў і паказальнікі да гэтых выданняў (прававых актаў; афіцыйных дакументаў палітычных партый і грамадскіх аб’яднанняў);
2) паказальнікі нарматыўных вытворча-практычных выданняў у розных галінах сацыяльнай сферы (напрыклад, адукацыйных стандартаў, стандартаў сістэмы СИБИД);
3) паказальнікі статыстычных публікацый;
4) паказальнікі твораў дзяржаўных, палітычных, гаспадарчых, грамадскіх, ваенных, рэлігійных дзеячаў, юрыстаў, падагогаў, журналістаў, вучоных-гуманітарыяў, дзеячаў культуры, выдавецкай, бібліятэчнай, архіўнай, музейнай справы і г. д. (у т.л. прыжыццёвых і рэдкіх выданняў, мемуарнай, эпісталярнай спадчыны, дзённікаў; паказальнікі да выданняў);
5) паказальнікі выданняў кананічных рэлігійных тэкстаў (напрыклад, кніг Свяшчэннага Пісання), паказальнікі да гэтых выданняў, паказальнікі абразоў;
6) паказальнікі сацыяльна-гуманітарных перыядычных выданняў і выданняў, якія прадаўжаюцца, паказальнікі іх зместу;
7) паказальнікі картаграфічных дакументаў, атласаў (сацыяльна-эканамічных, палітычных, гістарычных, ваенных, этнаграфічных, лінгвістычных);
8) паказальнікі лістовак, плакатаў, паштовак, фотадакументаў;
9) паказальнікі даведачных выданняў, слоўнікаў;
10) паказальнікі доктарскіх, кандыдацкіх і магістэрскіх дысертацый, аўтарэфератаў дысертацый;
11) паказальнікі выданняў навукова-даследчых інстытутаў, устаноў вышэйшай адукацыі, бібліятэк, іншых арганізацый і ўстаноў;
12) паказальнікі вучэбных і вучэбна-метадычных выданняў, наглядных дапаможнікаў;
13) каталогі, тэматычныя планы выдавецтваў, праспекты выданняў устаноў і арганізацый;
14) каталогі спецыялізаваных бібліятэк сацыяльна-гуманітарнага профілю (педагагічных, рэлігійных, бібліятэк выдавецтваў, прыватных бібліятэк вучоных-гуманітарыяў, грамадскіх дзеячаў і г.д.);
15) паказальнікі калекцый рэдкіх кніг у фондах бібліятэк (рукапісаў і кніжных збораў гістарычных асоб, вучоных-гуманітарыяў і інш.);
16) паказальнікі дакументаў з архіваў, музейных збораў;
17) паказальнікі некралогаў;
18) паказальнікі аўдыёвізуальных дакументаў, грампласцінак, відэазапісаў, слайдаў:
19) паказальнікі дакументаў на машыначытальных носьбітах (кампакт-дыскаў, баз дадзеных і інш.);
20) паказальнікі бібліяграфічнай прадукцыі (бібліяграфічных выданняў; рэфератыўных, аглядных выданняў; неапублікаванай бібліягр. прадукцыі; даведнікі па каталогах і картатэках, бібліяграфічных базах дадзеных, бібліяграфічных рэсурсах інтэрнэт).

---

* паказальнікі, спісы, каталогі, картатэкі, агляды, пералікі, базы дадзеных і г.д. Далей у тэксце – паказальнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3.2.Тэматыка і метадычныя рэкамендацыі да правядзення семінарскіх заняткаў

## Цэнтры фарміравання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь

Семінар[4]

***Прыкладныя пытанні да абмеркавання:***

1. Цэнтры фарміравання інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў у сферы праватворчай, праваахоўнай і правапрымяняльнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь.
2. Цэнтры інфармацыйна-бібліяграфічнага забеспячэння прафесійнай практычнай дзейнасці ў розных сферах сацыяльнага жыцця (эканомікі, педагагічнай дзейнасці, бібліятэчнай, музейнай, архіўнай справы, журналістыкі і выдавецкай справы) у Рэспубліцы Беларусь.
3. Цэнтры інфармацыйна-бібліяграфічнага забеспячэння сацыяльна-гуманітарных навук у Рэспубліцы Беларусь.
4. Цэнтры фарміравання інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў у дапамогу прафесійнай сацыяльна-гуманітарнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.
5. Цэнтры фарміравання інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў у дапамогу самаадукацыі карыстальнікаў сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

У працэсе правядзення семінара выкарыстоўваюцца вынікі самастойнай працы студэнтаў па вывучэнні вопыту дзейнасці розных тыпаў цэнтраў па фарміраванні інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь.

[4]Семінар праводзіцца ў форме вучэбнай навукова-практычнай канферэнцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па выніках выступлення і абмеркавання на семінары дзейнасці цэнтраў фарміравання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь кожны студэнт фармулюе прапановы па ўдасканаленні дзейнасці аналізуемага ім цэнтра, а таксама па распаўсюджванні яго інавацыйнага вопыту ў іншых цэнтрах. Прапановы афармляюцца пісьмова і здаюцца разам з тэкстам даклада ў якасці дадатка да яго.

Літаратура:

1. Агеева, Е. Президентская библиотека Республики Беларусь и органы государственной власти: история 80-летнего сотрудничества / Елена Агеева // Бібл. свет. – 2013. – № 6.– С. 6–7.
2. Березкина, Н. Ю. Создание и использование электронных информационных ресурсов в библиотеках Беларуси / Н. Ю. Березкина [и др.] ; ЦНБ им. Я. Коласа. – Мн. : Красико-принт, 2002. – 143 с.
3. Бібліяграфічныя дапаможнікі Беларусі ў 2001–2005 гадах : агляды : дадатак да “Паказальніка бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі, 2005” / Нац. кн. палата Беларусі. – Минск., 2006. 64 с. – Са зместу: Даніленка, Л. І. Бібліяграфічныя дапаможнікі па сацыяльных і гуманітарных навуках. – С. 14–24 ; Даніленка, Л. І. Бібліяграфічныя дапаможнікі па эканоміцы і эканамічных навуках. – С. 25–28 ; Даніленка, Л. І. Бібліяграфічныя дапаможнікі па праве і юрыдычных навуках. – С. 29–32 ; Даніленка, Л. І. Бібліяграфічныя дапаможнікі па адукацыі і педагагічных навуках. – С. 33–37 ; Кузьмініч Т. В. Бібліяграфічныя дапаможнікі па гісторыі і гістарычных навуках. – С. 59-63.
4. Знак, М. В. Новые формы обслуживания правовой информацией в Национальной библиотеке Беларуси / М. В. Знак , Н. А. Вишневская // Материалы III Международного конгресса "Библиотека как феномен культуры": чтение и информационная культура в современном обществе, Минск, 21–22 окт. 2015 г. / Нац. б-ка Беларуси ; науч. ред. Р. С. Мотульский. – Минск, 2015. – С. 317–321.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Кузьмініч, Т. В. Нацыянальная бібліятэка Беларусі як цэнтр бібліяграфіі па айчыннай гісторыі / Кузьмініч Т.В. // Здабыткі: Дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2004. – Вып. 6. – С. 6-20.
6. Кузьминич, Т. В. Национальная библиотека Беларуси как центр библиографической деятельности: современное состояние [Текст] / Кузьминич, Т. В. // Библиотековедение 2011, №2. – С. 91-96; то же [Электронный ресурс] // НББ в пресее. – Режим доступа : http://old.nlb.by/press/show_article.php?id=5605.
7. Соболевская, О. Церковные библиотеки в информационном пространстве Беларуси // Бібл. свет. – 2013.– № 1. – С. 15–17.
8. Сятковская, Н. Библиотека Белорусского государственного педагогического университета им. М. Танка / Надежда Сятковская // Библ. свет. – 2014. – № 6. – С. 20–22.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Інфармацыйныя рэсурсы сацыяльна-гуманітарнай сферы: традыцыі і навацыі

Вучэбная навукова-практычная канферэнцыя

***Мэта:*** садзейнічаць творчаму засваенню курса, сфарміраваць навыкі выкарыстання элементаў навукова-даследчай работы ў прафесійнай дзейнасці па фарміраванніівыкарыстанніінфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы.

***Змест і методыка выканання.*** Кожны студэнт пад кіраўніцтвам выкладчыка выбірае актуальную праблему прафесійнай бібліяграфічнай дзейнасці ў сацыяльна-гуманітарнай сферы і рыхтуе даклад (паведамленне) на вучэбную навукова-практычную канферэнцыю.

Вывучэнне праблемы ажыццяўляецца па ўсіх даступных студэнту крыніцах: навуковай літаратуры, публікацыях у прафесійным перыядычным друку, інтэрнэт-рэсурсах. Для збору неабходнай інфармацыі выкарыстоўваюцца таксама сацыялагічныя і іншыя метады (інтэрв’ю з супрацоўнікамі бібліятэк).

Пры вызначэнні тэматыкі дакладаў на канферэнцыю рэкамендуецца выкарыстоўваць вынікі лабараторных і практычных заняткаў па дысцыпліне.

Вынікі даследавання праблемы прадстаўляюцца ў форме ***даклада*** на адным з секцыйных пасяджэнняў канферэнцыі, прыстэндавага даклада або паведамлення на “круглым стале”. Да даклада абавязкова прыкладаецца спіс выкарыстаных крыніц.

У працэсе выступлення на выставачных стэндах экспануюцца бібліяграфічныя, рэкламныя, інструктыўна-метадычныя выданні бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў па тэме выступлення. Даклад можа суправаджацца электроннай прэзентацыяй, якая ўключае схемы, табліцы, дыяграмы, фотаздымкі і іншыя ілюстрацыйныя матэрыялы, падрыхтаваныя дакладчыкам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Праблемнае поле канферэнцыі:**

***Секцыя 1***. Дакументныя крыніцы сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі як аб’ект бібліяграфавання: ад вытокаў да сучаснасці.

***Секцыя 2.*** Бібліяграфічныя рэсурсы сацыяльна-гуманітарнайсферы ў прасторы і часе.

***Секцыя 3.*** Традыцыйныя і інавацыйныя тэхналогіі фарміравання і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ў інфармацыйным грамадстве.

***Секцыя 4.*** Праблемы фарміравання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы на старонках прафесійных перыядычных выданняў і навуковах форумах.

**Патрабаванні да афармлення даклада:**

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку (поўнасцю) аўтара/сааўтараў, назва даклада.
2. Аб’ём даклада разам з ілюстрацыямі і дадаткамі – не больш 6 старонак фармата А4, Times New Roman, 13 кегль, палутарныміжрадковы інтэрвал, тып файла – doc ці rtf (Microsoft Word).
3. Спіс выкарыстаных крыніц афармляецца пасля асноўнага тэксту ў алфавітным парадку. Спасылкі афармляюцца ў канцы сказу, напрыклад: [3, с. 15].

**Крыніцы пошуку інфармацыі:**

1. База данных «Библиотечное дело и библиография» [Электронный ресурс] / Росинформкультура. – Режим доступа : http://infoculture.rsl.ru/. – Дата доступа : 26.05.2017.
2. Библиотечное и информационное обслуживание [Электронный ресурс]. – Режим доступа : dlib.eastview.com. – Дата доступа : 26.05.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Научная электронная библиотека eLIBRARY.RU / ООО Научная электронная библиотека. –2000-2017.– Режим доступа : https://elibrary.ru/. – Дата доступа : 26.05.2017.

**Прыкладная тэматыка дакладаў**
на вучэбную навукова-практычную канферэнцыю
"Інфармацыйныя рэсурсы сацыяльна-гуманітарнай сферы:
традыцыі і навацыі"

1. Библиотека имени Дага Хаммаршёльда Организации Объединенных наций: ресурсы и услуги.
2. Бібліяграфічныя рэсурсы бібліятэк устаноў вышэйшай (юрыдычнай, або эканамічнай, або педагагічнай, або інш.) адукацыі ў дапамогу выкладанню сацыяльна-гуманітарных дысцыплін і навуковым даследаванням. (На прыкладзе інфармайных рэсурсаў бібліятэк
    a. БДПУ імя. М.Танка,
    b. БДЭУ,
    c. аддзела абслугоўвання юрыдычнай літаратурай ФБ БДУ,
    d. аддзела абслугоўвання факультэта міжнародных зносін ФБ БДУ і інш).
3. Бібліяграфічныя рэсурсы бібліятэк устаноў вышэйшай педагагічнай адукацыі Рэспублікі Беларусь і (ці) краін СНД па тэорыі і практыцы выхавання.
4. Інфармацыйныя рэсурсы Сінадальнай бібліятэкі Маскоўскага патрыярхата: традыцыі і навацыі. (http://biblsinod.ru/index.php/homepage)
5. Інфармацыйны рэсурс "Бібліятэка ў друку (прэсе)": асаблівасці стварэння і выкарыстання (на прыкладзе нацыянальных бібліятэк; або на прыкладзе абласных бібліятэк)
6. Інфармацыйныя рэсурсы "Установа вышэйшай адукацыі ў друку": асаблівасці стварэння і выкарыстання (на прыкладзе УВА сацыяльна-гуманітарнага профілю; …на прыкладзе БДУ культуры і мастацтваў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Великой Победе посвящается (обзор библиографических ресурсов областных/или публичных библиотек Беларуси, посвященных Великой Отечественной войне).
8. Рэпазіторыі бібліятэк установ вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь як сродак інфармацыйнага забеспячэння сацыяльна-гуманітарных даследаванняў і адукацыі.
9. Информационные ресурсы зал документов международных организаций Национальной библиотеки Беларуси.
10. Информационное обслуживание по правоведению в виртуальной среде (на примере виртуальной справочной службы Национальной библиотеки Беларуси).
11. Информационное обслуживание по социально-гуманитарным наукам в виртуальной среде (на примере виртуальной справочной службы ЦНБ НАН Беларуси.).
12. Выполнение библиографических справок по социально-гуманитарной тематике в Виртуальной справочной службе Корпорации универсальных научных библиотек (КОРУНБ).
13. «Национальная библиотека в помощь правоведу» как инструмент библиографического обслуживания пользователей правовой информации в социальной сети ВКонтакте.
14. Персональный сайт директора Национальной библиотеки Беларуси Р.С.Мотульского как информационный ресурс библиотековедения.
15. Персональные страницы историков как информационный ресурс.
    a. правоведов
    b. философов
    c. учёных-экономистов
    d. педагогов и т.п.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. РАЗДЗЕЛ КОНТРОЛЮВЕДАЎ, УМЕННЯЎ І НАВЫКАЎ

## 4.1. Графік кантролю за самастойнай працай студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Інфармацыйныя рэсурсы сацыяльна-гуманітарнай сферы”

| Тэма | Заданне | Форма кантролю |
|---|---|---|
| Тэма 1а. Дакументныя патокі ў галіне сацыяльна-гуманітарнай сферы | Нарматыўныя бюлетэні як крыніцы пошуку прававых актаў | Праверка пісьмовых работ |
| Тэма 1б. Дакументныя патокі ў галіне сацыяльна-гуманітарнай сферы | Бібліяграфічны пошук прававых актаў | Праверка індывідуальных заданняў |
| Тэма 2. Арганізацыя фарміравання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь | Цэнтры фарміравання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь | Праверка рэфератаў |
| Тэма 3. Тэхналогія стварэння інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы | Падрыхтоўка плана-праспекта паказальніка пэўнага віду сацыяльна-гуманітарных дакументаў | Праверка планаў-праспектаў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.2. Тэматыка і метадычныя парады да выканання заданняў смастойнай работыстудэнтаў

### Тэма 1а. Нарматыўныя бюлетэні як крыніцы пошуку прававых актаў

***Мэта:*** замацаваць уяўленні аб відах нарматыўных бюлетэняў, складзе іх навукова-даведачнага апарату (НДА) і пошукавых магчымасцях яго асобных элементаў.

Вынікі аналізу бюлетэняў афармляюцца ў таблічнай форме (гл. дадаткі да лабараторных заняткаў па тэме “Выданні прававых актаў як крыніцы бібліяграфічнага пошуку”).

***Пералік відаў нарматыўных бюлетэняў для аналізу:***

1. Нарматыўныя бюлетэні:

А) усіх органаў улады;

Б) органа заканадаўчай улады;

В) органа выканаўчай улады;

Г) органа судовай улады;

Д) міжведамасны;

Е) ведамасны.

### Тэма 1б. Бібліяграфічны пошук прававых актаў

***Мэта***: праверыць тэарэтычныя веды і сфарміраваць навыкі выканання розных відаў бібліяграфічнага пошуку прававых актаў.

***Змест і методыка выканання.***Заданне выконваецца пасля аўдыторных заняткаў па тэме “Інфармацыйна-пошукавая сістэма “Эталон””.

Кожны студэнт выконвае заданне ў адпаведнасці з індывідуальным варыянтам (“Індывідуальныя заданні для студэнтаў” – гл. с. ).Нумар варыянта, які адпавядае апошняй лічбе нумара студэнта ў спісе акадэмічнай групы, ўказваецца на вокладцы работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У рэжыме самастойнай працы выконваюцца заданні пад №№ 1в – д, 1ё, 2 і 3.

Работа афармляецца ў пісьмовым выглядзе па схеме ў фармаце А 4 (гл. дадатак “Бібліяграфічны пошук прававых актаў”, с. ).

Пытанні запісваюцца ў першым слупку табліцы ў паслядоўнасці, прадугледжанай варыянтам.

У графе “прыкметы пошуку” указваюцца звесткі аб аб’екце пошуку, якія прадстаўлены ў запыце (напрыклад: від прававога акта, дата прыняцця, назва органа дзяржаўнай улады, які прыняў акт, і г. д.). Від пошуку вызначаецца па мэце і адзначаецца знакам + у адпаведным слупку (№№ 3-9).

Крыніцы і шлях пошуку выбіраюцца з улікам назвы дзяржавы, органа(ў) дзяржаўнай улады і кіравання, якім(і) прыняты (выдадзены) акты, статуса прававога акта (напрыклад, дзеючы акт), тэмы акта і іншых прыкмет. Пошук можа ажыццяўляцца па ІПС “Эталон” і іншых поўнатэкставых базах даных дзеючага заканадаўства, Нацыянальнаму прававому Інтэрнэт-парталу Рэспублікі Беларусь і іншых крыніцах (гл. дадатак с. ).

Бібліяграфічнае апісанне крыніц пошуку і знойдзеных прававых актаў ажыццяўляецца пад назвай і павінна адпавядаць дзеючым стандартам (гл. узор:Примеры библиографического описания государственных информационно-правовых ресурсов и печатных изданий Национального центра правовой информации Республики Беларусь [Электронный ресурс] // Национальный правовой Интернет портал Республики Беларусь. – Режим доступа : http://www.pravo.by/main.aspx?guid=12631. – Дата доступа : 01.10.2015).

Пошук вытрымкі з тэксту нарматыўна-прававога акта і тэматычны пошук дакументаў дзеючага заканадаўства абавязкова ажыццяўляецца па адной з поўнатэкставых БД дзеючага заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Для тэматычнага пошуку выкарыстоўваюцца слоўнікі ключавых слоў і Адзіны прававы класіфікатар Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вынікі тэматычнага пошуку таксама афармляюцца па схеме. У спіс уключаецца 5-7 назваў дакументаў розных органаў дзяржаўнай улады.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дадатак **Бібліяграфічны пошук прававых актаў**

| Пытанне з указаннем парадкавага нумару | Прыкметы пошуку (што вядома ў запыце аб аб’екце пошуку) | Від пошуку | | | | | | | Бібліягр. апісанне крыніц пошуку (выкарыстаныя раздзелы, дапаможныя паказальнікі, рубрыкі, старонкі) | Адказ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Бібліяграфічны | | | | | Фактаграфічны | | | |
| | | Тэматычны | Удакладняючы | | | Адрасны | Пошук часткі тэксту дакумента (правав. акта) | Устанаўленне кім, калі прыняты дакумент | | |
| | | | Удакладненне бібліягр. звестак аб дакуменце (правав. акце) | Удакладненне бібліягр. звестак аб крыніцы вытрымкі з тэксту | Удакладненне бібліягр. звестак аб выданні дакументаў | | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 1. Дзе апублікаваны дакументы:<br>…<br>б) Закон Республики Беларусь “О высшем образовании” | Від прававога акта, назва дзяржавы, назва прававога акта | | + | | | | | | Эталон 6.7 [Электронный ресурс]. Законодательство Республики Беларусь / Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. – Минск, 2015. | О высшем образовании [Электронный ресурс] : закон Республики Беларусь 11 июля 2007 г. № 252-З : утратил силу Кодексом Республики Беларусь от 13 января 2011 г. № 243-З // Эталон 6.7. Законодательство Республики Беларусь / Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. – Минск, 2015. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Бібліяграфічны пошук прававых актаў

Індывідуальныя заданні для студэнтаў

**Варыянт 1.**

1. Дзе апублікаваны дакументы:

а) Конвенция Совета Европы о противодействии торговле людьми;

б) Закон Республики Беларусь от 5 января 2015 г. “О рынке ценных бумаг”;

в) Директива Президента Республики Беларусь №3 от 14 июня 2007 г. «О приоритетных направлениях укрепления экономической безопасности государства»;

г) постановление Совета Министров Республики Беларусь “О Национальном фонде технических нормативных правовых актов”;

д) постановление Министерства юстиции Республики Беларусь «Об утверждении Инструкции о порядке совершения нотариальных действий»;

е) решение Минского областного Совета депутатов от 24 декабря 2015 г. “Об утверждении Инвестиционной программы Минской области на 2016 год”;

ё) Указ Президента Российской Федерации от 18.11.2015 г. «О Межведомственной комиссии по противодействию финансированию терроризма»?

2. Какое республиканское унитарное предприятие в соответствии с законодательством Республики Беларусь является оператором системы электронной очереди транспортных средств для въезда в автодорожные пункты пропуска через Государственную границу Республики Беларусь? Каким нормативным документом это установлено?

3. Складзіце для студэнта юрыдычнага факультэта спіс нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь аб прававым забяспячэнні праватворчай дейнасці.

**Варыянт 2.**

1. Дзе апублікаваны дакументы:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а) Соглашение между Правительством Республики Беларусь и Правительством Китайской Народной Республики о сотрудничестве в сфере образования от 10 мая 2015 г.;

б) Закон Республики Беларусь от 30 декабря 2015 г. “О государственно-частном партнерстве”;

в) Указ Президента Республики Беларусь “Об электронных интерактивных играх”;

г) постановление Совета Министров Республики Беларусь «О создании государственного учреждения «Республиканский центр полярных исследований»»;

д) постановление Министерства финансов Республики Беларусь «О регулировании депозитарной деятельности»;

е) решение Витебского областного Совета депутатов от 4 сентября 2014 г. “Об изменении административно-территориального устройства Городокского района Витебской области”;

ё) Федеральный закон РФ "О библиотечном деле"?

2. Якое азначэнне тэрміна “электронны дакумент” даецца дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь?

3 Складзіце для кіраўніка сельскагаспадарчага прадпрыемства спіс нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь аб ахове атмасфернага паветра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Варыянт 3.**

1. Дзе апублікаваны дакументы:

а) Договор о прекращении деятельности Евразийского экономического сообщества от 10 октября 2014 г.;

б) Закон Рэспублікі Беларусь “Аб аўтарскім праве і сумежных правах”;

в) Декрет Президента Республики Беларусь от 28 декабря 2014 г. «О неотложных мерах по противодействию незаконному обороту наркотиков» ;

г) постановление Совета Министров Республики Беларусь «О порядке регистрации договоров купли-продажи, мены, дарения транспортных средств» ;

д) постановление Министерства юстиции Республики Беларусь “О юридическом обслуживании населения в агрогородках”;

е) решение Гомельского областного Совета депутатов от 25 ноября 2015 г. “Об утверждении Инструкции о порядке назначения и выплаты именных стипендий перспективным спортсменам юношеского, юниорского и молодежного возраста Гомельской области”;

ё) Положение о порядке аккредитации представителей средств массовой информации Республики Узбекистан при органах государственной власти, принятое в конце 2006 г.;

2. Каким нормативно-правовым актом Республики Беларусь предусмотрено, что поставщики интернет-услуг обязаны хранить актуальные сведения о посещаемых пользователями интернет-услуг интернет-ресурсах. Укажите источник его официального опубликования.

3. Складзіце для навучэнца юрыдычнага каледжа спіс нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусьаб узаемадзеянні органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь з Інтэрполам.

**Варыянт 4.**

1. Дзе апублікаваны дакументы:

а) Соглашение между Правительством Республики Беларусь и Правительством Арабской Республики Египет о сотрудничестве в борьбе с преступностью;

б) Кодекс Республики Беларусь об образовании;

в) Указ Президента Республики Беларусь “О документировании населения Республики Беларсуь”;

г) постановление Совета Министров Республики Беларусь «Об оптовой торговле, осуществляемой в форме электронной торговли»;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

д) постановление Совета директоров Национального банка Республики Беларусь “О выпуске в обращение памятной монеты Национального банка Республики Беларусь “Крыж Еўфрасінні Полацкай”;

е) решение Гомельского областного Совета депутатов “Об утверждени границ запретных для охоты зон на территории Гомельской области и их описания” ;

ё) Закон Республики Молдова о местном публичном управлении?

2. Как определяется информационная безопасность, по законодательству Республики Беларусь?

3. Складзіце для супрацоўнікаў музея спіс дзеючых нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь аб ахове і выкарыстанні гісторыка-культурнай спадчыны.

**Варыянт 5.**

1. Дзе апублікаваны дакументы:

а) Конвенция о правах ребенка;

б) Закон Республики Беларусь “О противодействии экстремизму”;

в) Указ Президента Республики Беларусь “О предоставлении права на использование официального сокращенного названия Республики Беларусь”;

г) постановление Совета Министров Республики Беларусь «Об особенностях таможенной процедуры таможенного транзита при доставке международных почтовых отправлений»;

д) инструкция о порядке оказания содействия в бытовом и трудовом устройстве лицам, освобождённым от отбывания наказания в виде лишения свободы, утверждённая Министерства внутренних дел Республики Беларусь;

е) решение Гродненского областного Совета депутатов от 11 июля 2014 г. “Об утверждении Инструкции о порядке проведения работ по преобразованию коммунальных унитарных предприятий, имущество которых находится в собственности Гродненской области, в открытые акционерные общества”;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ё) Указ Президента Российской Федерации 2015 г. «О создании Общероссийской общественно-государственной детско-юношеской организации «Российское движение школьников»»?

2. С какой целью, в соответствии с законодательством Республики Беларусь, создана Единая база данных донорства крови и ее компонентов? Приведите выдержку из текста документа. Укажите источник его официального опубликования.

3. Складзіце для настаўнікаў сярэдняй школы спіс дзеючых нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусьаб асаблівасцях крымінальнай адказнасці асоб, якія здзейснілі злачынствы ва ўзросце да 18 гадоў.

**Варыянт 6.**

1. Дзе апублікаваны дакументы:

а) Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Польшча аб супрацоўніцтве ў галіне папярэджвання катастроф, стыхійных бедстваў, іншых надзвычайных сітуацый, а таксама ліквідацыі іх вынікаў (ад 23 красавіка 2015 г.);

б) Закон Рэспублікі Беларусь “Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь”;

в) Указ Президента Республики Беларусь от 18 января 2016 г. «Об открытом акционерном обществе "Белорусская валютно-фондовая биржа"»;

г) постановление Совета Министров Республики Беларусь «О документах, являющихся основанием для регистрации граждан по месту жительства или месту пребывания» ;

д) пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь “Аб Рэспубліканским бібліятэчным савеце”;

е) решение Гродненского областного Совета депутатов от 28 сентября 2015 г. “Об утверждении Инструкции о порядке проведения ежегодного конкурса педагогических работников и тренеров-преподавателей по спорту”;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ё) Указ Президента Российской Федерации от 31.12.2015 г. № 683 “О Стратегии национальной безопасности Российской Федерации”?

2. Какие сведения, в соответствии с законодательством Республики Беларусь, включаются в государственный информационный ресурс «Реестр бытовых услуг Республики Беларусь». Каким нормативно-правовым актом предусмотрено создание ресурса? Укажите источник его официального опубликования.

3. Складзіце для журналіста-міжнародніка спіс дзеючых нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь аб мытных ільготах.

**Варыянт 7.**

1. Дзе апублікаваны дакументы:

а) Соглашение о сотрудничестве государств - участников Содружества Независимых Государств в области предупреждения и ликвидации чрезвычайных ситуаций ;

б) Закон Рэспублікі Беларусь аб інфарматызацыі;

в) Указ Президента Республики Беларусь «Об учреждении официальных геральдических символов административно-территориальных единиц Минской области»;

г) Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 21 января 2016 г. “Об открытии Посольства Республики Беларусь в Грузии”;

д) постановление № 92 Министерства здравоохранения Республики Беларусь “Об организации диспансерного наблюдения взрослого населения Республики Беларусь”;

е) решение Брестского областного Совета депутатов от 11 сентября 2012 г. “Об определении официального периодического печатного издания”;

ё) закон Республики Армения о местном самоуправлении;

2. Какие персональные данные, в соответствии с законодательством Республики Беларусь, включаются в автоматизированную информационную систему персональных данных пассажиров воздушных судов? Каким

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нормативно-правовым актом предусмотрено создание данной АИС? Укажите источник его официального опубликования.

3 Складзіце для супрацоўнікаў служб занятасці насельніцтва спіс дзеючага заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб сацыяльнай абароне беспрацоўных.

**Варыянт 8.**

1. Дзе апублікаваны дакументы:

а) Меморандум о взаимопонимании между Министерством культуры Республики Беларусь и Министерством образования и культуры Республики Индонезия о сотрудничестве в области культуры от 6 октября 2015 г.;

б) закон Республики Беларусь “О рекламе”;

в) декрет Президента Республики Беларусь “Об установлении размеров социальных пенсий”;

г) пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 578 «Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей»;

д) Постановление Министерства образования Республики Беларусь от 20 марта 2015 «Об утверждении Инструкции о порядке использования средств семейного капитала на получение образования»;

е) решение Могилевского областного Совета депутатов от 27 июля 2015 г. “Об утверждении Программы социально-экономического развития юго-восточного региона Могилевской области на период до 2020 года”;

ё) "Кодекс административного судопроизводства Российской Федерации";

2. Какие лица, в соответствии с законодательством Республики Беларусь, имеют доступ к информации о пациентах, содержащейся в Единой системе учета лиц, потребляющих наркотические средства, психотропные вещества, их аналоги. Каким нормативно-правовым актом это определено? Укажите источник его публикации.

3. Складзіце для карыстальнікаў бібліятэкі сямейнага чытання спіс дзеючых нарматыўных актаў Рэспублікі Беларусь аб сацыяльнай абароне сем’яў, якія выхоўваюць дзяцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Варыянт 9.**

1. Дзе апублікаваны дакументы:

а) Международной конвенции о борьбе с допингом в спорте;

б) Закон Рэспублікі Беларусь “Аб дзяржаўнай статыстыцы”;

в) Указ Президента Республики Беларусь “О порядке проведения и контроля внешнеторговых операций”;

г) постановление Совета Министров Республики Беларусь «О республиканском биологическом заказнике “Лебяжий”» ;

д) постановление Министерства связи и информатизации Республики Беларусь “О некоторых вопросах государственной регистрации информационных ресурсов”;

е) решение Гомельского областного Совета депутатов от 23 декабря 2011 г. “Об установлении границ города Турова Гомельской области”;

ё) Постановление Правительства РФ от 10 декабря 2015 г. “О мерах по реализации программы «Жильё для российской семьи»”;

2. В каких доменных зонах, в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь, регистрируют доменные имена государственные организации? Каким нормативно-правовым актом это определено? Укажите источник его публикации.

3. Складзіце для студэнтаў медыцынскага універсітэта спіс дзеючых нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь аб донарстве і трансплантацыі органаў і тканін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Варыянт 10.**

1. Дзе апублікаваны дакументы:

а) Международная конвенция об охране прав исполнителей, производителей фонограмм и вещательных организаций;

б) закон Республики Беларусь о научной деятельности;

в) Указ Президента Республики Беларусь «О лотерейной деятельности на территории Республики Беларусь»;

г) постановление Совета Министров Республики Беларусь «О категориях работников, которым не устанавливается ненормированный рабочий день» ;

д) Приказ Национального статистического комитета Республики Беларусь «О ведении государственной статистики в 2016 году»;

е) решение Брестского областного Совета депутатов от 10 сентября 2015 г. “Об утверждении Региональной программы по развитию и содержанию местных автомобильных дорог в Брестской области на 2015-2019 годы “;

ё) Конституция Украины?

2. Якое азначэнне тэрміна “сайт” даецца дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь? Якім нарматыўна-прававым актам гэта вызначана?

3. Складзіце для аспіранта эканамічнага ўніверсітэта спіс дзеючых нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь аб дзейнасці свабодных эканамічных зон.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМА 2. **Цэнтры фарміравання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь**

Кожны студэнт знаёміцца з інфармацыйнымі рэсурсамі аднаго з цэнтраў фарміравання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы (спіс дадаецца, с.   ).

Вывучэнне інфармацыйных рэсурсаў абранай бібліятэкі (цэнтра) ажыццяўляецца па афіцыйнаму сайту, артыкулах, апублікаваных у перыядычных і неперыядычных выданнях, планах работы і справаздачах, іншай дакументацыі. Праводзяцца таксама інтэрв'ю (гутаркі) з супрацоўнікамі бібліятэкі.

Вынікі самастойнай працы прадстаўляюцца ў форме рэферата (аб'ёмам 6 старонак).

У рэфераце могуць быць адлюстраваны наступныя аспекты:

Поўная афіцыйная (і скарочаная) назва бібліятэкі (цэнтра). Ведамасная прыналежнасць.

Дата заснавання. Кароткія гістарычныя звесткі (нарыс) аб фарміраванні інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў бібліятэкі.

Якія сферы сацыяльнага жыцця, галіны сацыяльна-гуманітарных навукзабяспечвае інфармацыйнымі рэсурсамі бібліятэка (цэнтр).

Катэгорыі карыстальнікаў сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ў бібліятэцы (цэнтры). Асаблівасці іх інфармацыйных патрэбнасцей (тэматыка патрэбнасцей, у т.л. па рэгіёназнаўчай прыкмеце; патрэбнасці ў асобных відах дакументаў, дакументах розных гадоў, на розных мовах, на розных носьбітах (неапублікаваных, друкаваных, аудыёвізуальных, машыначытальных). Фактары, якія ўплываюць на іх інфармацыйныя патрэбнасці (структура установы – напрыклад, установы вышэйшай вдукацыі: факультэты, кафедры; тэматыка навукова-даследчай работы і да т. п.). Колькасныя паказчыкі (ці прыклады) разавых і пастаянных запытаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Дакументы** сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі на розных, у т. л. электронных, носьбітах **у фондах** бібліятэкі (цэнтра), іх склад па змястоўнай, відавой, моўнай і інш. прыкметах. Спецыфічныя для бібліяткі (цэнтра) часткі фонду.

*Асноўныя*напрамкі фарміравання інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі:

1. Фарміраванне **ДБА** бібліятэкі (цэнтра). Характарыстыка складу і асаблівасцей фарміравання асобных частак ДБА:
   1.1. Даведачна-бібліяграфічны фонд (фонд афіцыйных, даведачных, бібліяграфічных выданняў). Яго відавы і змястоўны склад, адпаведнасць профілю бібліятэкі (цэнтра), прыклады спецыфічных, унікальных выданняў ў складзе ДБФ. (Да рэферату ў якасці дадатка пажадана прыкласці выбарачны спіс выданняў з ДБФ, які ілюструе яго адметныя часткі).
   1.2. Адлюстраванне сацыяльна-гуманітарных дакументаў у каталогах і картатэках. Бібліятэчна-бібліяграфічныя класіфікацыі, якія выкарыстоўваюцца для арганізацыі электроннага (сістэматычнага) каталога, прыклады тэматычных і спецыялізаваных картатэк.
   1.3. БД сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі ў складзе ДБА (уласнай вытварчасці і знешнія).
   1.4. Web-старонка бібліятэкі (цэнтра) ў інтэрнэце як крыніца бібліяграфічнай інфармацыі па сацыяльна-гуманітарнай тэматыцы (БД бібліятэкі (цэнтра) даступны карыстальнікам праз інтэрнэт, віртуальныя кніжныя выставы, віртуальныя даведачныя службы). Іншыя спосабы прадстаўлення бібліяграфічнай інфармацыі аб сацыяльна-гуманітарных дакументах на сайце бібліятэкі і ў сацыяльных медыя.
   1.5. **Бібліяграфічныя выданні** сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі (***бягучыя,рэтраспектыўныя, рэкамендацыйныя).***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. **Выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі ў бібліяграфічным абслугоўванні.**
   2.1. Бібліяграфічнае інфармаванне (індывідуальнае, групавое, масавае);
   2.2. Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне (тэматыка і віды даведак, крыніцы выканання).
3. **Фарміраванне бібліяграфічнай культуры** карыстальнікаў сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі.
4. Выкарыстанне **аўтаматызаваных тэхналогій** у бібліяграфічнай дзейнасці з сацыяльна-гуманітарнымі дакументамі:
5. Сувязі цэнтра (бібліятэкі) з іншымі цэнтрамі фарміравання ІР СГС (Рэспублікі Беларусь, РФ, інш. краін). Удзел бібліятэкі ў бібліяграфічных кансорцыўмах (па фарміраванні бібліяграфічных рэсурсаў, забеспячэнні доступу да іх, даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні ў электронным асяродку і інш.).
6. Высновы і прапановы; 1) па ўкараненні вопыту бібліяграфічнай дзейнасці аналізуемага цэнтра (бібліятэкі) ў іншых цэнтрах фарміравання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы; 2) па ўдасканаленні бібліяграфічнай дзейнасці з сацыяльна-гуманітарнымі дакументамі ў дадзеным цэнтры з улікам вопыту іншых.

Да рэферата прыкладаюцца:

1. **Каталожная картка са звесткамі аб бібліятэцы** (цэнтры), якая павінна ўключаць:
   Поўную і скарочаную афіцыйную **назву** бібліятэкі (цэнтра) з указаннем ведамаснай прыналежнасці. Поўны паштовы **адрас**. **Тэл**.-факс. Адрас электроннай пошты (**e-mail**). Адрас **WEB-старонкі**. ***Прозвішча***, імя, імя па бацьку дырэктара, кіраўніка бібліяграфічнага аддзела ці іншага ***супрацоўніка***, з якім вялася размова.
2. Бібліяграфічны **спіс выкарыстаных крыніц** (навейшых артыкулаў пра бібліятэку (цэнтр), выданняў бібліятэкі, планаў работы і справаздач, іншай дакументацыі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. **Дадаткі** (рэкламныя буклеты, выданні бібліятэкі, інструкцыі па пошуку інфармацыі ў лакальных БД і інтэрнэце, схемы, табліцы і г.д.).

Падрыхтаваныя рэфераты заслухоўваюцца на семінары, які праводзіцца ў форме вучэбнай навукова-практычнай канферэнцыі.

## СПИСОК
## центров формирования информационных ресурсов социально-гуманитарной сферы в Республике Беларусь

1. Международная юридическая библиотека Общественного объединения «Белорусский республиканский союз юристов» http://www.union.by/info/library
2. Центральная научная библиотека им. Я. Коласа Национальной Академии наук Беларуси http://csl.bas-net.by
3. Центр медиаресурсов и библиотечной работы ГУО "Минский областной институт развития образования" www.moiro.by
4. Государственное учреждение «Белорусский институт системного анализа и информационного обеспечения научно-технической сферы» (ГУ «БелИСА») Государственного комитета по науке и технологиям Республики Беларусь http://www.belisa.org.by/
5. Библиотека Музея истории Великой Отечественной войны; http://www.warmuseum.by
6. Библиотека Учреждения «Белорусский научно-исследовательскийинститутдокументоведенияиархивногодела» (БелНИИДАД)
7. Отдел информационно-поисковых систем и Отдел использования документов и информации ГУ «Национальный архив Беларуси» http://www.narb.by/
8. Научно-справочная библиотека Национального исторического архива Беларуси niab.by

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. Библиотека ГНУ "Научно-исследовательский экономический институт Министерства экономики Республики Беларусь"http://www.economy.gov.by/ru/niei/institut
10. Научная библиотека НИИ труда Министерства труда и социальной защиты Республики Беларус; сайт института: http://www.instlab.by/, http://mintrud.gov.by/niitruda
11. Информационный пункт Совета Европы в Минске
12. Центр информационного сотрудничества Республиканского института китаеведения имени Конфуция при БГУ
13. Библиотека Информационного центра Посольства США http://belarusian.minsk.usembassy.gov/irc.html
14. Информационно-библиотечный отдел Института Гёте https://www.goethe.de/ins/by/be/min/kul/bib.html
15. Центральная библиотека ГКДУ "Центральный Дом офицеров Вооруженных Сил Республики Беларусь" http://www.mil.by/ru/leisure/DOF/
16. Библиотека УО "Военная академия Республики Беларусь"
17. Библиотека УО «Минское суворовское военное училище»http://msvu.schools.by/
18. Отдел обслуживания Института журналистики и факультета философии и социальных наукБГУhttp://www.journ.bsu.by/
19. Отдел обслуживания факультета международных отношенийБГУ fir.bsu.by
20. Отдел обслуживания юридического факультетаБГУ http://www.law.bsu.by/
21. Библиотека УО «Академия управления при Президенте Республики Беларусь», http://www.pac.by/ru/biblioteka
22. Библиотека УВО "Минский государственный лингвистический университет" http://mslu.by/ob-universitete/biblioteka
23. Библиотека УО «Белорусский государственный педагогический университет им. Максима Танка» http://library.bspu.unibel.by/,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

24. Библиотека УО "Белорусский государственный экономический университет" library.bseu.by
25. Центральная библиотека УО "Академия МВД Республики Беларусь" http://academy.mia.by/index.php/ru/otdely/bibl
26. Научная библиотека по физической культуре и спорту УО "Белорусский государственный университет физической культуры" http://www.sportedu.by/biblioteka
27. Библиотека Государственного учреждения образования «Академия последипломного образования»http://www.academy.edu.by/academy/library.html
28. Библиотека Государственного образовательного учреждения высшего профессионального образования «Московский государственный университет экономики, статистики и информатики (МЭСИ)» Минский филиал МЭСИ http://www.mfmesi.ru
29. Библиотека УО "Минский университет управления" http://www.miu.by/rus/library
30. Библиотека УО "Частный институт управления и предпринимательства" http://www.imb.by/new/studentu.htm#bibl
31. Библиотека филиала государственного образовательного учреждения высшего профессионального образования «Российский государственный социальный университет» в г. Минске Республики Беларусь http://www.rgsu.by
32. Библиотека ЧУО "БИП-Институт правоведения" http://bip-ip.by/biblioteka
33. Библиотека ЧУО "Институт парламентаризма и предпринимательства"http://www.ipp.by
34. Библиотека ЧУО "Институт предпринимательской деятельности" http://www.uoipd.by/ru/institute/biblioteka.html
35. УК "Брестская областная библиотека им. М. Горького" http://www.brl.by
36. ГУ "Витебская областная библиотека им. В. И. Ленина" http://vlib.by

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

37.ГУ "Гомельская областная универсальная библиотека им. В. И. Ленина" goub.org

38.ГУК "Гродненская областная научная библиотека им. Е. Ф. Карского" http://www.grodnolib.by

39.ГУ "Минская областная библиотека им. А. С. Пушкина" http://pushlib.org.by/

40.УК "Могилевская областная библиотека им. В. И. Ленина" http://library.mogilev.by

41.Центральная городская библиотека им. Янки Купалы ГУ "Централизованная система государственных публичных библиотек г. Минска", http://publib.by

42. Библиотека Государственного учреждения образования «Институт теологии имени святых Мефодия и Кирилла» Белорусского государственного университетаhttp://theology.bsu.by/node/432/biblioteka

43.Библиотека Минской духовной академии http://minda.by

44.Библиотека минского прихода иконы Божией Матери «Всех скорбящих Радость» http://sobor.by/biblioteka_prihoda_vseh_skorbiaschih_radost.htm

45.Библиотека им. А. Мицкевича при костёле СвСв. Симеона и Елены

46.Библиотека еврейского культурного общества “Эмуна”

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэма 3. **Падрыхтоўка плана-праспекта паказальніка пэўнага віду сацыяльна-гуманітарных дакументаў**

**Мэта**:

– фарміраванне ўяўленняў аб перспектыўных накірунках развіцця інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы;

– адпрацоўка навыкаў вызначэння актуальных тэм і праблем, якія патрабуюць спецыялізаванага забеспячэння інфармацыяй аб асобных відах сацыяльна-гуманітарных дакументаў, вывучэння стану іх бібліяграфічнай забяспечанасці;

– развіццё творчых здольнасцей ініцыіраваць стварэнне арыгінальных інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы;

– замацаванне навыкаў падрыхтоўкі планаў-праспектаў бібліяграфічнай прадукцыі на прыкладзе паказальнікаў сацыяльна-гуманітарных дакументаў крыніцазнаўчага значэння.

**Змест і методыка выканання**: Кожны студэнт самастойна распрацоўвае план-праспект падрыхтоўкі бібліяграфічнага дапаможніка, які адлюструе асобны від сацыяльна-гуманітарных дакументаў крыніцазнаўчага значэння.

